№ 36 (681) 22 верасня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

**Джамахерыя беларускай дыпламатыі**

Старонка 7



**Чаму дзяўчаты любяць дрэнных хлопцаў**

Старонка 13



**Пазаштатны біёграф Лукашэнкі**

Старонка 12

**Выбар-2010**

• **Мілінкевіч сыходзіць, але не развітваецца.** Лідар Руху «за Свабоду» не будзе балатавацца ў прэзідэнты.

• **Мілінкевіч адмовіўся дзяліць прэмію з Някляевым?** Прэмія мела стаць эстафетнай палачкай.

• **Акадэмік Гарэцкі падтрымаў Саннікава.** Слынны геолаг: Някляеў і Саннікаў могуць стварыць моцны тандэм.

Старонка 3.

• **Маніякальная надзея знайсці адзінага.** Круглы стол з кіраўнікамі перадвыбарчых штабоў у рэдакцыі «НН».

• **Лукашэнка павіншаваў Петрасяна з народзінамі,** аднак праігнараваў Мядзведзева.

• **З'явіўся кандыдат Іваноў.** Загадкавы Сяргей Іваноў абвесціў пра свой намер балатавацца праз інтэрнэт.

Старонка 8.

• **«Я прыняў рашэнне. Перамагчы і стаць прэзідэнтам».** Лідар кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў ідзе на выбары.

• **Перад Аранжавай рэвалюцыяй начштаба Някляева працаваў на Януковіча.** У 2004-м ён разам з Партыяй Рэгіёнаў Украіны прайграў прэзідэнцкія выбары, а ў 2003-м з СПС не адолеў 5-працэнтавы бар'ер.

• **Як увайсці ў ініцыятыўныя групы кандыдатаў?**

Старонка 9.

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Краіне пагражае дэфіцыт валюты

Перавышэнне попыту над прапановай на валютна-фондавай біржы дасягнула рэкорда.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Міністр фінансаў Андрэй Харкавец і старшыня Нацбанка Пятро Пракаповіч.**

Стан бягучага рахунку Беларусі пагаршаецца. Працяглы час попыт на даляры і еўра на Беларускай валютна-фондавай біржы (БФВБ) стабільна перавышае прапанову. Гэты дысбаланс зразумелы. Апошнія гады краіна экспартуе менш, чым імпартуе. Розніцу пакрывалі замежныя крэдыты і сродкі ад прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці.

Пад восень дэфіцыт бягучага рахунку ўзрос анамальна.

Гэта можна звязаць з павышэннем расходаў дзяржавы ў сувязі з адміністратыўным ростам заробкаў да 500 даляраў — пад выбары.

Падставы для трывогі насамрэч ёсць. У жніўні попыт на даляры на БФВБ перавысіў прапанову на 312 мільёнаў. А за дваццаць дзён верасня ўжо на 307!

Тое самае з еўра. У жніўні попыт быў большы за прапанову на 40 млн, а ў верасні ўжо на 68.

І для амерыканскай валюты, і для еўрапейскай такі дэфіцыт з'яўляецца рэкордным пасля піку сусветнага фінансавага крызісу ў канцы 2008 года.

Для параўнання, у маі-чэрвені для даляраў і еўра перавышэнне попыту над прапановай складала ў сярэднім $250 і 40 мільёнаў еўра за месяц.

Валюту на БВФБ прадаюць і набываюць прадпрыемствы і банкі для сваёй бягучай дзейнасці. А дэфіцыт кампенсуецца валютнымі інтэрвенцыямі Нацбанка, для якіх выкарыстоўваюцца рэзервы.

Рэзервы, разлічаныя па метадалогіі МВФ, па стане на 1 верасня складалі 5 млрд 569 млн долараў. З пачатку 2010 года яны скараціліся толькі на 83 млн.

Аднак такі паказчык быў дасягнуты за кошт паступлення грошай ад размяшчэння еўраоблігацый ($1 млрд), ад продажу «Белтрансгаза» Расіі (625 млн) і апошняй траншы крэдыту МВФ (670 млн).

Калі б не гэтыя сродкі, то рэзервы скараціліся б амаль на 2,3 млрд. У прыватнасці, у чэрвені — на 253 млн, ліпені — на 193 млн. А ў жніўні — ажно на $762 млн.

**Працяг на старонцы 2.**

# Невядомая радзіма Макея

Таямніца месца нараджэння Уладзіміра Макея раскрытая. Карэспандэнт «НН» пабываў у родной вёсцы кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта і паразмаўляў з яго сваякамі.

Біяграфія кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі, як і біяграфія кожнага разведчыка, была ахінутая таямніцамі. Не было звестак нават пра месца нараджэння!

Афіцыйныя крыніцы ўказвалі, што Макей нарадзіўся «5 жніўня 1958 года ў Гродзенскай вобласці». Але дзе дакладна? Невядома было, хто бацькі ўплывовага чыноўніка, як ён гадаваўся, як выпускнік Інстытута замежных моваў апынуўся ў маскоўскай сакрэтнай вучэльні, а пасля на дыпламатычных курсах у Аўстрыі...

Запушчаная кімсьці чутка называла месцам нараджэння Макея Слонімшчыну. Адпаведны запіс нават з'явіўся ў беларускай інтэрнэт-энцыклапедыі «Вікіпедыя». Пацвярджэння не было. Як і абвяржэння.

Але тое, што невядома біёграфам, ведаюць жыхары Карэліччыны. «Якая таямніца? Макей хадзіў у школу ў Луках, а сам родам з суседніх Некрашэвічаў!» — расказаў нашаніўцам адзін з нашых чытачоў.

Сапраўды, том з серыі «Памяць» пра Карэліччыну згадваў трох Макеяў з вёскі Некрашэвічы, што загінулі на вайне. Яшчэ столькі ж цёзак на прозвішчу ці сваякоў трапілі ў спіс «Прайшлі дарогамі вайны». Відаць, мы на правільным шляху. Карэспандэнт «НН» скіраваўся на землі, што восем стагоддзяў таму сталі калыскай беларускай дзяржаўнасці.

### Калыска высокіх чыноўнікаў

У Некрашэвічы вядуць дзве дарогі, але тая, якой ад Мінска бліжэй, — гравійная.

Машына паўзе кіламетр за кіламетрам, а вёскі ўсё не відаць. Там, дзе на мапе пачынаюцца Некрашэвічы, ля дарогі ў цені дрэваў размясціўся хутар.

Гаспадыня — бабулька 83-х гадоў Соф'я Турок — расказвае, што сама з Макеем не знаёмая, але ведала ягоных бацькоў. Ай, харошыя былі людзі!

Але і ёй самой ёсць кім пахваліцца! У суседняй хаце вырас міністр па падатках і зборах Уладзімір Палуян. Кажуць, што будучыя міністр і кіраўнік Адміністрацыі нават сябравалі. Невялікая розніца ва ўзросце спрыяла — Макей усяго на тры гады старэйшы.

### Госці ад Валодзі

І вось перад намі — стрыечная цётка кіраўніка Адміністрацыі. Раней яна была суседкай Макеяў, іх хата стаяла праз дарогу. Але пазней яна згарэла. Сям'я пераехала на іншы край вёскі. На папялішчы стаіць будынак «Белпошты».

Як толькі бабулька пачынае аповед, да нас падыходзіць родная цётка і хросная маці кіраўніка Адміністрацыі, Вера Паўлаўна.

«Вы родныя мне ці як?» — ласкава ўсміхаецца яна.

Спадарыня Вера — сястра Уладзіміра Паўлавіча Макея, бацькі кіраўніка Адміністрацыі.

**Працяг на старонцы 10.**

# Краіне пагражае дэфіцыт валюты

Працяг са старонкі 1.

Мяркуючы па вераснёўскім попыце на валюту, калі ён захаваецца да канца месяца, у верасні ЗВР могуць упасці на астранамічную лічбу, здольную выклікаць паніку на рынках. Запланаваным размяшчэннем аблігацый у расійскіх рублях на 15 млрд такое падзенне не скампенсуецца. Тады можа паўтарыцца сітуацыя 2008 года, якая прывяла да дэвальвацыі рубля.

На піку фінансавага крызісу ў 2008 годзе дэфіцыт бягучага рахунку дасягаў маштабаў, сувымерных з цяперашнімі. Тады выкліканае ім скарачэнне валютных рэзерваў (без уліку атрыманых крэдытаў) складала $691 млн у кастрычніку 2008-га, $654 млн — у лістападзе 2008-га, $920 млн — у студзені 2009 года, на хвалі панікі пасля 20-працэнтавай дэвальвацыі.

У канцы жніўня небяспечныя тэндэнцыі на рынку ўжо былі тэмай сустрэчы Лукашэнкі з кіраўніком Нацбанка Пятром Пракаповічам. Учора, 20 верасня, кіраўніка Нацбанка зноў выклікалі ў Чырвоны дом. «Стабільнасць курсавой палітыкі заснавана не толькі на пасяховай рабоце нашай эканомікі, але і на тым, што мы маем дастаткова золатавалютных рэзерваў», — супакойваў рынак Пракаповіч.

Можна чакаць ад уладаў нейкіх надзвычайных крокаў для аднаўлення стабільнасці.

Гэта можа быць пачатак новых перамоваў з Міжнародным валютным фондам або прыватызацыя аднаго з буйных дзяржаўных прадпрыемстваў нафтахіміі ці «Беларуськалія». Або — што найменш імаверна — чарговай разавай дэвальвацыі рубля.

Найбольш імаверным сцэнаром падаецца паскораная прыватызацыя, бо сродкаў ад яе хопіць на даўжэйшы час. Праўда, імклівасць азначае горшую цану і большую верагоднасць, што актывы дастануцца расійскаму капіталу, на долю якога прыпадае і так непрапарцыйна вялікая доля замежных інвестыцый у Беларусь.

**Сяргей Гезгала, Алесь Пілецкі**

# Місію назіральнікаў СНД узначаліць калега Саннікава па Дыпакадэміі

Місіяй ад СНД будзе арганізаванае доўгатэрміновае і кароткатэрміновае назіранне за прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі. Пра гэта паведамілі ў Выканкаме СНД.



Тэрміны пачатку працы назіральнікаў будуць вызначаны пасля прызначэння кіраўніка місіі і акрэдытацыі назіральнікаў у Цэнтрвыбаркаме. Запыт на атрыманне анкет для акрэдытацыі ў ЦВК Выканкам СНД ужо накіраваў.

Чакаецца, што 23 верасня на пасяджэнні Савета пастаянных паўнамоцных прадстаўнікоў пры статутных і іншых органах СНД на пасаду кіраўніка місіі будзе ўзгодненая кандыдатура выканаўчага сакратара СНД Сяргея Лебедзева.

Як раней паведамляў навінавы партал udf.by, назіральнікі ад СНД за прэзідэнцкімі выбарамі пачнуць працаваць у Беларусі ў бліжэйшыя дні. Такія дадзеныя прывяла старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына.

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька заявіў, што было б добра, калі б і місія СНД і місія АБСЕ па назіранні за прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі аб'ядналі свае намаганні. Як выказаўся палітык, «ідэальным варыянтам была б адна сістэма назірання пад эгідай АБСЕ, тым больш што краіны СНД з'яўляюцца сябрамі АБСЕ».

**МБ; інф. БелаПАН, udf.by**

**Сяргей Лебедзеў**

старшыня Выканаўчага камітэта — Выканаўчы сакратар СНД з 5 кастрычніка 2007 Нарадзіўся 9 красавіка 1948 ва Узбекістане. Скончыў у 1970 Чарнігаўскі філіял Кіеўскага політэхнічнага інстытута. З 1973 — у органах дзяржбяспекі, з 1975 — у знешняй разведцы (Першае галоўнае ўпраўленне КДБ СССР). Мае контрразведніцкую падрыхтоўку (Кіеўская школа КДБ) і разведадукацыю (Чырванасцяжны інстытут КДБ). У 1978 скончыў Дыпламатычную акадэмію МЗС СССР. Валодае нямецкай і ангельскай мовамі. Ад 2000 — дырэктар Службы знешняй разведкі Расеі. Воінскае званне — генерал арміі. Хобі — праца, сям'я, лецішча.

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Свята ў сядзібе Агінскага

У Залессі (Смаргонскі раён) 25 верасня пройдуць мерапрыемствы, прысвечаныя 245-годдзю з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага, якое будзе адзначацца 7 кастрычніка. Свята пачнецца аб 11-й гадзіне ў сядзібе кампазітара. Выступяць смаргонскія творчыя калектывы. У святкаванні мае ўзяць удзел таксама аркестр дзяржаўнай філармоніі «Класік Авангард», які выконвае творы Агінскага.

Яшчэ ў сядзібе можна паглядзець палац Агінскіх, стары парк і маляўнічыя княскія сажалкі.

**СМ**

## Новы ARCHE №6'2010




**Юрый Шэрах (Шавялёў).** Праблемы фармавання беларускай мовы.

**Гародня: сляды яўрэйскага жыцця.** Праваднік па яўрэйскай Гародні.

**Віталь Сіліцкі.** Кухонная апазіцыя гаворыць па-руску.

Пытайцеся ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў.

## Сцісла

• **Колькасць старых аўтамабіляў, што ўвозяцца ў Беларусь, скароцяць.** Эколагі і транспартнікі рыхтуюць новыя меры. Старыя аўтамабілі падзеляць на шэсць экалагічных класаў, у залежнасці ад выкідаў забруджвальных рэчываў. Увоз аўтамабіляў нізкіх экалагічных класаў плануецца абмежаваць, у тым ліку за кошт спецыяльных мытных плацяжоў.

• **Бабіна лета працягваецца.** 22 верасня днём у паўночна-ўсходніх раёнах кароткачасовыя дажджы. Уначы па поўдні месцамі туман. Вецер паўднёва-заходні з пераходам на паўночна-заходні 5—10 м/с, днём парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ноччу плюс 5—11°C, днём плюс 11—18°C. 23 верасня пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў. Вецер заходні, паўднёва-заходні 4—9 м/с. Тэмпература паветра ноччу плюс 3—8°C, на тарфяніках Палесся магчымы слабыя замаразкі да 0 — мінус 2°C, днём плюс 14—21°C.

• **На «Мінск- Арэне» пабіты рэкорд наведвальнасці матчаў КХЛ.** Матч «Дынама» Мінск — «Ак Барс» (Казань) 21 верасня наведалі 15 тысяч 530 гледачоў. Дагэтуль рэкорд належаў матчу СКА (Пецярбург) — «Дынама» Рыга 24 студзеня 2010 года. Яго наведалі 12 090 гледачоў. Рэкорд наведвальнасці для мінскага «Дынама» — 11 342 чалавекі на матчы супраць ЦСКА 5 лютага 2010 года.

• **Грашовыя пераказы па новых правілах.** Ад 23 верасня ўступіць у сілу закон «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях прадухілення, легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, і фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці». У сувязі з гэтым унесеныя змяненні ў правілы аказання паслуг паштовай сувязі. Аператар сувязі павінен атрымаць і захоўваць інфармацыю аб фізічнай асобе ці арганізацыі, якія здзяйснялі грашовыя пераказы на суму ад 100 базавых велічынь (акрамя разлікаў з выкарыстаннем банкаўскіх картак). Асоба, якая здзяйсняе падобную аперацыю, мусіць паведаміць прозвішча, імя і імя па бацьку, нумар рахунка ці фінансавай аперацыі, месца жыхарства, пашпартныя звесткі. Калі не паведамляе, аператар мае права адмовіць у абслугоўванні.

• **Бараніў правы спажыўца з пісталетам.** 26-гадовы беспрацоўны мінчук узяў напракат у адным з салонаў камп'ютарныя дыскі. Дома выявіў, што яны не працуюць, і вярнуўся да пракатчыкаў з пнеўматычным пісталетам і ў нецвярозым стане. Пісталет ён прыставіў да скроні работніка салона. Гаспадар салона выхапіў пісталет з рук зламысніка, следам з'явілася выкліканая міліцыя і яго затрымала.

**СМ**

## Самае чытанае на nn.by за 15—21 верасня

- Самыя ідыёцкія беларускія рэкламы
- Мілінкевіч сыходзіць, але не развітваецца
- Някляеў: Я прыняў рашэнне. Перамагчы і стаць прэзідэнтам
- Беларускія кандытары вырабілі шакаладную Хатынь
- Беларускія баскетбалісткі першымі ў свеце згуляюць у сукенках
- «Ненавідзім беларускую мову!»
- Перад Аранжавай рэвалюцыяй начштаба Някляева працаваў на Януковіча
- Падтрымаўшы Кастусёва, Мілінкевіч згуртуе нацыянальныя сілы
- Чаму дзяўчаты любяць дрэнных хлопцаў
- Englishman in Minsk

## nn@nn.by

Усяго 2% вулічных дарог у Мінску зручныя для веласіпедыстаў. І трохі больш — для аўтамабілістаў.

**Кнехт**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

які padпісваюцца праз Рэдакцыю

Рыце Н., Уладзіміру Ч., Дзмітрыю Х.,Юрыю Ш., Вользе Ш., Алене М., К.М., Л.А., А.Р. з Мінска.
С.Р., А.С., Т.Ш. з Бярозаўскага раёна.
Антону Т. са Смалявіцкага раёна.
В.Р. з Мастоўскага раёна.
Уладзіміру Д. з Барысаўскага раёна.
Аляксандру Б., Васілю Г. з Мінскага раёна.
С.А. з Полацкага раёна.
І.Н., Наталлі Б. з Гродна.
Яўгену К. са Шклова.

# Мілінкевіч сыходзіць, але не развітваецца

Лідар Руху «За Свабоду» не будзе балатавацца ў прэзідэнты.

Аляксандр Мілінкевіч адмовіўся ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах у якасці кандыдата. Пра гэта ён заявіў на прэс-канферэнцыі 17 верасня.

Прычынаў адмовы дзве. Галоўнай умовай удзелу Мілінкевіча было патрабаванне зменаў у выбарчым заканадаўстве. А менавіта — падлік галасоў з удзелам незалежных назіральнікаў. Ад імя Руху «За Свабоду» ў АБСЕ, БДІПЧ, Еўрапарламент, Еўракамісію, Раду Еўропы, амбасадарам Еўрасаюза і СНД у Мінску былі накіраваныя лісты з просьбай зрабіць выкананне гэтага патрабавання галоўнай умовай прызнання выбараў у Беларусі. Аднак 14 верасня старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына заявіла, што ніякіх зменаў у заканадаўстве не будзе.

«Не хачу ўдзельнічаць у спектаклі, дзе адзін рэжысёр і сцэнарыст, не хачу быць статыстам», — падкрэсліў Мілінкевіч. Ён не выключае, што сёння ўсё ідзе да чарговага самапрызначэння Лукашэнкі на пасаду кіраўніка краіны.

Другая прычына ягонай адмовы заключаецца ў адсутнасці адзінства ў апазіцыі.

На яго думку, сітуацыя ў 2006 г. і сёлета моцна розняцца. Тады Лукашэнка меў моцную падтрымку ўнутры краіны, не ваяваў з Расіяй і быў ізаляваны ад Захаду. Апазіцыя таксама была мацнейшаю тады, кажа Мілінкевіч. У 2006 апазіцыя здолела аб'яднацца, цяпер гэтага няма.

Мілінкевіч падкрэсліў, што ў мінулую кампанію апазіцыя ўяўляла сабой маральную альтэрнатыву рэжыму, цяпер жа яна павінна быць альтэрнатывай прабеларускай. «Вельмі важна засведчыць, што ёсць такія сілы, якія стаяць на нацыянальных, беларускіх пазіцыях».

Кажучы пра Плошчу, палітык заявіў, што гэта адзін са спосабаў адстойвання сваіх правоў. Галоўнае, каб яе сцэнар пісаўся ў Беларусі, каб ён прадугледжваў выключна мірныя дзеянні.

Мілінкевіч не спыніць палітычнай і грамадскай дзейнасці. У гэтай выбарчай кампаніі ён будзе падтрымліваць блок трох праеўрапейскіх кандыдатаў: Алеся Міхалевіча, Рыгора Кастусёва і Юрыя Глушакова. Лідар Руху «За Свабоду» будзе ўдзельнічаць у зборы подпісаў, пікетах і сустрэчах з выбаршчыкамі. Прадстаўнікі блока і Мілінкевіч публічна падпісалі пагадненне Грамадзянская акцыя «Беларускі выбар».

**Сямён Печанко**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Каментар Паўла Мажэйкі: Мілінкевічу след падтрымаць кандыдата Партыі БНФ — **старонка 7**.

**Карняенка: Памылка, якая можа стаць фатальнай**

Рашэнне Мілінкевіча не балатавацца стала моцным расчараваннем для ягонага намесніка Віктара Карняенкі. У інтэрв'ю парталу Euramost.org ён заявіў, што лічыць сыход Мілінкевіча з прэзідэнцкай выбарчай дыстанцыі вялікай памылкай, якая можа стаць для палітыка фатальнай. На яго думку, на сёння «ніхто, акрамя Мілінкевіча, не можа аб'яднаць у адну каманду патрыятычныя сілы краіны», бо «ўсе астатнія прэтэндэнты адстойваюць альбо свае вузкапартыйныя альбо асабістыя амбіцыйныя задачы».

**Wpolityce.pl: Польшча пакінула Мілінкевіча**

Прычынай адмовы Мілінкевіча ад кандыдацтва стала спыненне падтрымкі з боку Захаду. У прыватнасці, Польшчы, піша польскі партал wpolityce.pl. Афіцыйная Варшава зрабіла гэта на карысць паляпшэння адносінаў з Масквой. Без падтрымкі пакінулі не толькі Рух «За Свабоду», але і іншыя беларускія незалежныя структуры, у тым ліку Саюз палякаў. Такім чынам Варшава хоча прадэманстраваць Маскве, што пакідае Беларусь у яе зоне ўплыву, мяркуе выданне.

**Моцны сігнал Еўропе і свету**

На дэмарш Мілінкевіча адрэагавала Еўрапейская Народная Партыя. Яна падтрымала рашэнне палітыка не вылучацца на прэзідэнцкіх выбарах, «бо ўмовы для свабодных і справядлівых выбараў не будуць забяспечаныя». «Прэзідыум ЕНП занепакоены тым, што падчас гэтых выбараў беларускія ўлады зноў могуць пайсці на парушэнні міжнародных і еўрапейскіх дэмакратычных стандартаў. У гэтай сітуацыі ЕНП падтрымлівае рашэнне Аляксандра Мілінкевіча не ўдзельнічаць у выбарах, што будзе моцным сігналам як для Беларусі і Еўропы, так і для ўсяго свету», — падкрэсліў прэзідэнт ЕНП Вільфрыд Мартэнс.

## Мілінкевіч адмовіўся дзяліць прэмію з Някляевым?

Прэмія мела стаць эстафетнай палачкай.

Паводле інфармацыі «Нашай Нівы» з годных даверу крыніц, існавала магчымасць, што прэстыжная польская прэмія імя Валэнсы будзе ўручаная Мілінкевічу ў пары з Някляевым. Прэмія мела стаць свайго роду эстафетнай палачкай між ранейшым лідарам апазіцыі і новым.

Аднак, з аднаго боку, уручэнню прэміі Някляеву запярэчыў Станіслаў Шушкевіч, сябар камітэта па прысуджэнні гэтых прэмій. З другога, кажуць, прэміі адрокся сам Мілінкевіч, тым самым адмовіўшыся прызнаваць і аўтарытэт новага лідара.

Узнагарода была заснаваная Лехам Валэнсам у гонар 25-годдзя ўручэння яму Нобелеўскай прэміі міру, якая дапамагла яму як лідару апазіцыі захаваць свабоду, а можа і жыццё ў падсавецкай Польшчы.

У Варшаве Някляева лічаць прарасійскім кандыдатам, блізкім да «Газпрома». Уручэнне прэміі яму мела быць жэстам на адрас Расіі: мы прызнаём за вамі права сказаць сваё слова адносна будучыні Беларусі на гэтых выбарах.

Лідар Руху «За Свабоду» не раз падкрэсліваў, што дазваляць Расіі ўмешвацца ва ўнутрыбеларускія справы небяспечна для незалежнасці краіны.

Існуе і іншы пункт гледжання: змена ўлады ў Беларусі можа адбыцца толькі пры скаардынаваным ціску Расіі і Захаду.

**Мікола Бугай**

## Акадэмік Гарэцкі падтрымаў Саннікава

Слынны геолаг: Някляеў і Саннікаў могуць стварыць моцны тандэм.

Былы віцэ-прэзідэнт НАН Беларусі Радзім Гарэцкі далучыўся да ініцыятыўнай групы лідара грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Андрэя Саннікава. Пры гэтым навуковец не хавае сваіх сімпатый да паэта Уладзіміра Някляева, які ў гэтай прэзідэнцкай кампаніі ўзначаліў грамадзянскую кампанію «Гавары праўду».

«Шчыры паэт, у некаторай сітуацыі ён можа стаць нашым Вацлавам Гаўлам. Ён сёння вельмі актыўны — падтрымаў гэты рух, узначаліў яго. І гэта вельмі важна, бо сёння мы проста патанаем у хлусні. Ён не толькі добры паэт, але і выдатны арганізатар», — характарызуе Някляева Радзім Гарэцкі.

Чаму тады ўсё ж Саннікаў? «Бо ён мае большы дзяржаўніцкі досвед, палітычны. Ён добры гаспадарнік».

Навуковец лічыць, што найлепшым варыянтам была б супольная праца Саннікава і Някляева: «Калі б аб'яднаць іхнія патэнцыялы — выйшаў бы добры тандэм». Спадар Гарэцкі ўпэўнены, што абодва гэтыя кандыдаты будуць трымацца прабеларускай лініі ў палітыцы. «Сённяшні рэжым — антыбеларускі. Таму любы палітык, які дбае пра нашу культуру і мову, будзе лепшы за Лукашэнку», — упэўнены акадэмік.

Хто яшчэ з вядомых беларусаў падтрымае кандыдатуру Саннікава на выбарах? Спіс складаецца ўнушальны: ад моладзі да ветэранаў. Гэта першы кіраўнік незалежнай Беларусі Станіслаў Шушкевіч, экс-старшыня Вярхоўнага Савета XII склікання генерал Мечыслаў Грыб, адзін з заснавальнікаў Партыі БНФ прафесар Юры Хадыка, былы суддзя Канстытуцыйнага суда Валер Фадзееў, член-карэспандэнт НАН, прафесар Іван Нікітчанка, паэт Сяргей Законнікаў, кінарэжысёр Юрый Хашчавацкі, удава зніклага журналіста Змітра Завадскага Святлана Завадская, моладзевыя актывісты Яўген Афнагель ды Паліна Кур'яновіч.

**СП**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Саннікаў прадае кватэру, каб мецьгрошы на кампанію**

«Лукашэнка не мае права ўдзельнічаць у выбарах, — зазначае ён у сваім звароце і тлумачыць:
— Былі ліквідаваныя палітычныя праціўнікі Лукашэнкі. У 2004 годзе ён у чарговы раз памяняў Канстытуцыю, замахнуўшыся на пажыццёвае праўленне. Былі парушаныя не толькі законы, але і нормы маралі. Вынікі непрызнаных выбараў і рэферэндумаў забяспечвала цяперашняя старшыня ЦВК Ярмошына. За фальсіфікацыю выбараў міжнародная супольнасць ўвяла супраць яе санкцыі, якія дзейнічаюць да гэтага часу».

Чаму ж Саннікаў ідзе на такія выбары? «Сёння з'явілася рэальная магчымасць разарваць заганнае кола», — тлумачыць ён. Каб удзельнічаць у выбарчай кампаніі, палітык вырашыў прадаць сваю кватэру.

Сваім лозунгам ён вылучае дэвіз «За нармальную Беларусь!»

**МБ**

КУР'ЁЗ

## Google translate ўчыніў «правакацыю» супраць Някляева

Пераклад артыкула палітолага Аляксандра Фядуты з расійскай мовы на беларускую з дапамогай папулярнага інтэрнэт-перакладчыка Google translate даў мне нечаканы вынік.

Так, пераклад сказа «Что же до Некляева, то на меня он производит впечатление сильного, целеустремленного человека, прогрессирующего на пути превращения деятеля культуры в общественного деятеля, а теперь и в политика» выглядае наступным чынам: «Што ж да Някляева, то на мяне ён вырабляе ўражанне моцнага, мэтанакіраванага чалавека, прагрэсуючага на шляху пераетварэння дзеяча культуры ў грамадскага дзеяча, а зараз і ў Аляксандра Мілінкевіча».

Калі не зважаць на пэўныя агрэхі ў перакладзе, кшталту «выробляе ўражанне» ды «прагрэсуючага», то атрымліваецца амаль паводле Маякоўскага: «Мы говорим «партия», подразумеваем — Ленин».

**Сямён Печанко**

**Google translate**

высакаякасны сэрвіс электроннага перакладу ад сайта Google.com. Перакладае з і на 58 найважнейшых моваў свету, у тым ліку і беларускую. Яго беларускі перакладчык створаны намаганнямі і талентам беларуса Ігара Маханька і іншых інтэрнэтчыкаў–энтузіястаў. Але як і ў любым электронным перакладніку, здараюцца ў ім і кур'ёзы.

# Бюджэт-2011: гуляць дык гуляць!

Дзяржаўныя выдаткі павялічаныя ва ўсіх істотных сферах грамадскага жыцця.

Згодна з новым бюджэтам, у 2011 годзе мяркуецца патраціць на 18% больш, чым летась. Гэта каля 3,5 мільярда дадатковых даляраў у параўнанні з мінулым годам! Гуляць дык гуляць — відаць, менавіта пад такім песенным лозунгам чыноўнікі падышлі да фармавання бюджэту на наступны год. Яго разгляд адбываецца ўжо ў верасні — вельмі рана. Папярэдні раз парламент зацвярджаў галоўны фінансавы дакумент пад канец снежня. Але цяпер задача прадэманстраваць эканамічную стабільнасць краіны актуальная, як ніколі.

### Адкуль грошы?

Даходы кансалідаванага бюджэту чакаюцца ў памеры 54,2 трыльёна рублёў. У адпаведнасці з планаваным курсам даляра гэта складзе каля $17 мільярдаў. Найбольш плануецца атрымаць ад падаткаў. Напрыклад, адзін толькі падатак на дададзеную вартасць забяспечвае 25% ад кансалідаванага бюджэту.

У агульную лічбу ўваходзяць і даходы фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Іншымі словамі — абавязковыя страхавыя адлічэнні ў «пенсійны фонд». Пакуль што Беларусь яшчэ ў стане хаця б ураўноўваць гэтыя паступленні з выдаткамі на дапамогу пенсіянерам.

### Паказальна сацыяльны

Бюджэт выйшаў надзвычай сацыяльным. Павялічаныя выдаткі фактычна на ўсё — і на культуру, і на адукацыю, і на ахову здароўя. Расшчодрыліся і таму, што крызіс трохі адпусціў, і таму, што зараз у бюджэце можна напісаць што заўгодна. А пасля выбараў перагледзець.

**Выдаткі «сацыяльнай дзяржавы»**

| Артыкул бюджэту | 2011, $ млрд | 2010, $ млрд | падвышэнне, % |
|---|---|---|---|
| Пенсіі | 5,3 | 4,8 | +10 |
| Сацыяльная палітыка | 1,46 | 1 | +46 |
| Грашовая дапамога | 1,1 | 1 | +10 |
| Адукацыя | 0,7 | 0,46 | +52 |
| Ахова здароўя | 0,53 | 0,43 | +23 |
| Органы дзяржаўнага кіравання | 0,33 | 0,26 | +27 |
| Культура | 0,089 | 0,06 | +48 |

Найбольшы рост зафіксаваны ў галіне адукацыі — выдаткі павялічацца больш чым на палову! Нават падчарка-культура «падаражэла» на 48%.

На ажыццяўленне сацыяльных праграм выдаецца ўжо не мільярд, а ў паўтара разу больш. Не краіна — проста казка!.. Як вынік, ужо зараз выдаткі нашмат пераўзышлі меркаваныя прыбыткі. Розніца істотная — $2 мільярды. З дэфіцытам бюджэту будуць змагацца за кошт крэдытаў і выпуску новых аблігацый. Іншымі словамі, праблема памнажаецца, а яе вырашэнне перакладаецца на наступныя гады і чужыя плечы.

**Яўген Васількоў**

# Крыніца ў «Газпроме»: Расія мае павысіць цану газу для Беларусі на 35%

Між тым цэны на газ для Еўропы практычна не зменяцца.

Цана прыроднага газу для Беларусі з пачатку 2011 года складзе каля $250 за тысячу кубаметраў у залежнасці ад ваганняў цаны на нафту, паведаміла агенцтву «Інтэрфакс-Захад» крыніца ў газавай галіне.

«У пачатку 2011 года цана імпарту газу можа вырасці прыкладна да ўзроўню $250 за тысячу кубаметраў, зыходзячы з формулы цэнаўтварэння, ваганняў цаны на нафту і скасавання паніжальнага каэфіцыента», — сказала крыніца.

Такім чынам, у параўнанні з чаканай сярэднегадавой цаной 2010 года ($186 за тысячу кубоў — «Інтэрфакс»), цана з пачатку 2011 года для Беларусі вырасце прыкладна на 35% у выпадку захавання кантрактных умоў і пралангацыі адмовы расійскага боку ад збірання экспартных мытаў на газ пры яго пастаўках у Беларусь.

Варта адзначыць, што гэта будзе яўна палітычнае павышэнне, бо цана газу на еўрапейскіх рынках практычна не зменіцца. Яна прывязаная да цаны нафты, а тая вырасла за год нязначна. У той жа час варта адзначыць, што гэтым цана газу для Украіны і Беларусі проста выраўняецца. Рэч у тым, што раней Расія пастаўляла газ братняму аўтарытарнаму рэжыму па льготных тарыфах.

Каб павышэнне з новага года не выглядала такім рэзкім, прадстаўнікі «Газпрома» параўноўваюць будучую цану не з сярэднегадавой цаной 2010 года, а з цаной 4-га квартала, якая, па іхніх падліках, мае складсці 226 даляраў.

**Сяргей Гезгала**

# Новыя правілы Мытнага саюза

Беларусь пачынае змаганне з тымі, хто возіць з Еўропы зашмат пральнага парашку.

Не прайшло і паўгода з часу ўвядзення супольнай мытнай прасторы, як беларуская мытня вырашыла ў аднабаковым рэжыме падправіць некаторыя прынятыя пастулаты.

Гэта можна назваць чарговым этапам барацьбы з чаўнакамі XXI стагоддзя, якія возяць ужо не танныя шмоткі, але і дарагую тэхніку. Новыя правілы, уведзеныя з 15 верасня, рэгулююць такі тавараабарот. Цяпер той, хто заходзіць за ўсталяваны нарматыў, будзе вымушаны заплаціць яшчэ і размытнёўку.

Узяліся нават за ежу! Напрыклад, той, хто ездзіць праз мяжу штотыдзень, можа ўзяць з сабой не больш за 5 кілаграмаў прадуктаў. А той, хто выязджае з Беларусі штодзень, увогуле — толькі ежу на час падарожжа.

**ЯВ**

**Што можна завозіць бязмытна толькі раз на месяц (не больш за тры найменні):**
вопратку, запчасткі да транспарту, будаўнічыя матэрыялы, пральныя парашкі ў пакунках вагой большай за 3 кг.

**Што можна завозіць бязмытна толькі раз на год:**
пліты газавыя ці электрычныя, выцяжкі, кухонныя камбайны, мікрахвалёўкі, унітазы, халадзільнікі, маразільнікі, машыны пасудамыйныя, машыны пральныя і швейныя, маніторы з вадкакрышталічным экранам, ноўтбукі, кандыцыянеры, дзіцячыя каляскі.




**Заробкі ў сталіцах. Мінск — адзін з апошніх**

У выпадку Варшавы, Вільні, Прагі і Таліна за сярэдні заробак па сталіцах прыняты сярэдні заробак па краіне. У выпадку Мінска — сярэдні па горадзе. Сярэдні па Беларусі складае каля 430 даляраў.

**Алесь Пілецкі**

### Сцісла

• **Валавы замежны доўг Беларусі вырас да 45,5% ад ВУП.** На 1 ліпеня 2010 ён дасягнуў $23,2 млрд. Гэта больш за гадавы бюджэт краіны. У пераліку на душу насельніцтва валавы замежны доўг на 1 ліпеня склаў $2447 млрд. Паводле звестак Нацбанка, на яго абслугоўванне за першае паўгоддзе было накіравана $2,47 млрд.

• **Мінэканомікі адпусціла цэны на цэмент.** Яны рэгуляваліся з чэрвеня 2007 у сувязі з дэфіцытам цэменту. Цяпер сітуацыя стабілізавалася.

• **Лукашэнка запатрабаваў зменшыць дапамогу па беспрацоўі.** Ён растлумачыў сваё рашэнне тым, што цяпер у Беларусі колькасць вакансій большая за колькасць беспрацоўных. Дапамога па беспрацоўі ў Беларусі з'яўляецца адной з самых нізкіх на постсавецкай прасторы і складае каля $16.

• **Германія заняла першае месца па продажах аўтамабіляў у Еўропе.** Там было рэалізавана 200 тысяч аўтамабіляў. Другое месца ў Расіі — 170 тысяч машын. Тройку лідараў замыкае Францыя, якая рэалізавала 105,2 тысячы аўтамабіляў.

• **На Кубе звольняць 500 тысяч працоўных.** Таксама будуць зменшаныя абмежаванні для прыватных прадпрыемстваў на працаўладкаванне, каб дапамагчы звольненым знайсці працу. Масавае звальненне працоўных з'яўляецца самай важнай рэформай пасля таго, як Рауль Кастра змяніў на пасадзе прэзідэнта свайго брата Фідэля.

• **Беларусь на грошы ЗША вывезе ў Расію адпрацаванае ядзернае паліва.** Некалькі дзясяткаў кілаграмаў адпрацаванага паліва, назапашанага ў савецкія часы, загружаецца ў касеты. На працягу 1,5 месяца дадзенае пытанне будзе закрытае.

**ЯВ**

# Мыта на аўтамабілі не зменіцца да 1 ліпеня 2011

Дзяржаўны мытны камітэт Беларусі не прагназуе, што мыта на легкавікі, якія ўвозяцца ў Беларусь грамадзянамі для асабістага карыстання, зменіцца да 1 ліпеня 2011 года.

«У ДМК адсутнічаюць дадзеныя пра магчымую змену гэтай даты», — заявіў намеснік старшыні ДМК Беларусі Сяргей Барысюк.

Начальнік прававога ўпраўлення ДМК Аляксандар Адзярэйка нагадаў, што памер мыта на ўвоз фізічнымі асобамі ў Беларусь легкавых аўтамабіляў для асабістага карыстання ўключаны ў пералік выняткаў Мытнага кодэкса Мытнага саюза. У той жа час пытанне змены мытных ставак вырашаецца толькі пры ўзгадненні яго ўсімі краінамі Мытнага саюза.

«Беларусь у аднабаковым парадку змяніць дату не мае магчымасці», — адзначыў Адзярэйка.

У студзені—жніўні юрыдычныя і фізічныя асобы завезлі на тэрыторыю Беларусі 133 тыс. легкавых аўтамабіляў, пры гэтым 128 тыс. аўтамабіляў было ўвезена фізасобамі.

**Радыё «Свабода»**

# Беларускія ўлады хочуць даказаць сваю недатычнасць




АБСЕ накіруе двух крыміналістаў для расследавання прычын смерці Алега Бябеніна.

Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе задаволіла зварот беларускіх уладаў. У Мінск прыедуць два эксперты-крыміналісты для расследавання прычынаў смерці Алега Бябеніна, кіраўніка апазіцыйнага інтэрнэт-сайта Charter97.org.

Цяпер вырашаюцца тэхнічныя моманты.

Сёння любая краіна, якая ўваходзіць у АБСЕ, можа заявіць пра сваю гатоўнасць накіраваць эксперта ў Беларусь.

Рашэнне афіцыйнага Мінска прыцягнуць экспертаў-крыміналістаў з-за мяжы — беспрэцэдэнтнае і «крок беларускага ўрада дэманструе гатоўнасць правесці традыцыйнае для сучасных краін празрыстае і бесстаронняе расследаванне», — ухвальна заявіў кіраўнік дэлегацыі Еўрапарламента па сувязях з Беларуссю паляк Яцак Пратасевіч.

36-гадовага Бябеніна знайшлі павешаным у сябе на лецішчы. У Генпракуратуры разглядаюць у першую чаргу версію пра самагубства і сцвярджаюць, што ў крыві Бябеніна было шмат алкаголю.

Сябры ж загінулага цвердзяць, што на дачы стаялі дзве пустыя пляшкі ад «Беларускага бальзаму» і не было анікрыху ежы. Да таго ж, Бябенін вісеў шчыльна зашпілены. Між тым, гэта не характэрна пры засільванні. Таксама калегі кажуць, што ў Бябеніна не было ніякіх матываў для самагубства, а афіцыйныя дакументы аб яго смерці ўтрымліваюць шэраг супярэчнасцяў.

Сям'я Алега Бябеніна захоўвае маўчанне.

**Мікола Бугай**

# Беларускі клас у Баранавічах вырас утрая

Да Ясі Малашчанка далучыліся яшчэ дзве дзяўчынкі.

Адзіны на 168-тысячны горад беларускамоўны клас з'явіўся ў школе №14. Ён паўстаў дзякуючы намаганням сям'і Малашчанкаў, якія дзеля сваёй дачкі Ясі абышлі некалькі гарадскіх школ. Спачатку Яся вучылася адна, а потым да Малашчанкаў далучылася сям'я Алісы Філіпчык, а за імі наважылася і настаўніца першакласніц Ірына Міхальчук, якая прывяла ў клас сваю дачку Вераніку.

Таццяна Малашчанка расказала, як яны адстаялі беларускамоўнае навучанне ў родным горадзе. Спачатку ім прапанавалі не самую лепшую ў горадзе школу. «Я адразу патлумачыла чыноўнікам з аддзела адукацыі, што мы не хочам аддаваць дзіця ў гета. Прыгразіла, што буду звяртацца ў нашу і замежную прэсу, у Адміністрацыю».

Малашчанкам параілі самім хадзіць па школах і наўпрост звяртацца з заявамі да дырэктараў. У школе №14 яны і знайшлі паразуменне з адміністрацыяй.

Па словах Таццяны Малашчанка, дзецям добра пачуваецца ўтрох. Школа лічыцца адной з найлепшых у Баранавічах. Для дзяўчатак арганізавалі асобны клас, пасцялілі дыванок, павесілі дошку. «Яны не сумуюць, пасябравалі ўжо».

Тое, што вучняў толькі трое, бацькоў не бянтэжыць. «Я ўжо чула нават выказванні, што знайсці добрага рэпетытара, ды за дзяржаўны кошт — рэдкая раскоша. Некаторыя ўжо зайздросцяць».

Спадарыня Таццяна лічыць, што ім беларускамоўнае навучанне далося прасцей, чым прафесару Астроўскаму з Гродна. «Нам пікетаваць не давялося. Такое ўражанне, што ў гэтым годзе ў Баранавічах далі адмашку — каб стварылі хоць адзін клас».

**Сямён Печанко**

**З КАМЕНТАЎ НА NN.BY**

Думаю, на будучы год жадаючых вучыцца па-беларуску будзе болей. Разумны зразумее. Вось так негвалтоўна будучая беларуская эліта і вывучыцца.

**Вінт**






**Сябры Беларускай хрысціянскай дэмакратыі распачалі штодзённыя акцыі за вяртанне мінскага касцёла Святога Язэпа вернікам. І кожны дзень пасля тых, хто а 18-й моліцца за касцёл, а 19-й тут будуць збірацца неабыякавыя беларусы, у тым ліку з партрэтамі зніклых і палітвязняў.**

## За 20 гадоў насельніцтва Жлобіна вырасла на 35%, а Гродна — на 21%

Такія звесткі былі атрыманыя пасля правядзення агульнанацыянальнага перапісу насельніцтва, што прайшоў у кастрычніку 2009 года.

У Мінску жыве 1 млн 836,8 тыс. чалавек, на другім месцы па колькасці насельніцтва застаўся Гомель — 482,7 тыс, затым ідуць Магілёў (358,3 тыс.), Віцебск (347,9), Гродна (327,5), Брэст (309,8), Бабруйск (215,1).

**Гарады з колькасцю насельніцтва ад 100 да 200 тыс.**: Баранавічы (168,2 тыс.), Барысаў (147,4), Пінск (130,4), Орша (117,2), Мазыр (108,8) Салігорск (102,3 тыс.).

**Гарады з колькасцю насельніцтва ад 50 да 100 тыс.** — Наваполацк (98,1 тыс.), Ліда (97,6), Маладзечна (94,3), Полацк (82,5), Жлобін (75,9 тыс.), Светлагорск (70,0), Рэчыца (64,7), Жодзіна (61,7 тыс.), Слуцк (61,4), Кобрын (51 тыс.).

Цікава, што ў 1999 г. Наваполацк і Ліда былі гарадамі-стотысячнікамі.

У параўнанні з перапісам 1989 г., за дваццаць гадоў насельніцтва Мінска вырасла на 14,3%, Гомеля — зменшылася на 3%, Гродна і Брэста — вырасла амаль на 21%, а Віцебска і Магілёва — засталося амаль такім самым.

Рэкардсменам па прыросце стаў Жлобін: за дваццаць гадоў у ім дадалося 35% жыхароў.

Антырэкардсменам за дзесяць гадоў стаў Наваполацк: колькасць насельніцтва зменшылася на 7,1% — са 105,6 тыс. да 98,1 тыс.

**АГ**

## Мінтранс абвяшчае вайну нелегальным маршрутчыкам

Найбліжэйшым часам у Беларусі плануецца вырашыць праблему нелегальных маршрутных перавозак на гарадскіх і міжгародніх маршрутах, паведаміў журналістам намеснік міністра транспарту і камунікацый Аляксандр Шышко.

Падрыхтаваная пастанова ўрада, якой плануецца «адрэгуляваць нерэгулярныя маршрутныя рэйсы». Чакаецца, што дакумент будзе прыняты да канца верасня. Як заявіў Шышко, нелегальных вадзіцеляў у краіне «вельмі шмат». «Неабходна заканадаўча праводзіць конкурсы і выстаўляць іх на тыя маршруты, дзе яны жадаюць працаваць», — сказаў ён.

Паводле слоў намесніка міністра, вадзіцелі маршрутак часта грэбуюць пытаннямі бяспекі. Адзначаюцца выпадкі, калі аўтамабілі не адказваюць тэхнічным патрабаванням, вадзіцелі парушаюць правілы дарожнага руху. Акрамя таго, нелегальныя перавозчыкі пераваблiваюць пасажыраў у рэгулярных перавозчыкаў за кошт ніжэйшай цаны.

Таксама чыноўнік адзначыў, што ў суботу-нядзелю цэнтр сталіцы варта было б закрываць для транспарту. Бо аўтапарк краіны імкліва расце: на пачатак 2010 года ён налічваў больш як 3 млн 433 тыс. транспартных сродкаў і павялічыўся на 4,8% да ўзроўню 2008 года. Доля транспарту ў выкідах забруджвальных рэчываў у атмасферу ад усіх крыніц дасягае 72%, а ў гарадах — да 80%. У сярэднім за дзень у атмасферу ў 2009 годзе выкідвалася з адпрацаванымі газамі каля 3115 тон брудных рэчываў, у тым ліку ў Мінску — 537 тон.

**Паводле БелаПАН**




## Сцісла

• **Мініінфармацыі вынесла папярэджанне «Брестской газете».** Папярэджанне за распаўсюд непраўдзівай інфармацыі падпісала першая намесніца міністра інфармацыі Лілія Ананіч. Падставай для санкцыі стаў артыкул «Стомленых ад горада выратуюць экапаселішчы», надрукаваны 14 верасня. Як адзначае прэс-служба БАЖ, сама рэдакцыя газеты атрымала ліст ад Камянецкага райвыканкама, дзе ўказвалася на недакладнасці ў артыкуле. І рэдакцыя нават надрукавала яго 16 верасня ў якасці абвяржэння, якога патрабавалі раённыя ўлады. Тым не менш, Мініінфармацыі папярэдзіла выданне, не чакаючы выхаду абвяржэння. Інфармацыя, аналагічная той, што апублікавала «БГ», з'явілася і ў шэрагу іншых выданняў вобласці — у тым ліку ў афіцыйнай газеце «Заря». Тым, аднак, ніякіх санкцый не было.

• **Мінчукі трацяць за месяц амаль усё, што зарабляюць.** Наяўныя афіцыйныя даходы ў разліку на сям'ю ў сярэднім за месяц першага паўгоддзя склалі ў Мінску 2 млн 198 тыс. рублёў. Грашовыя выдаткі адной сям'і ў Мінску ў першым паўгоддзі ў сярэднім за месяц склалі 2 млн 151,3 тыс. рублёў. З іх 1715,1 тыс. рублёў (79,7%) былі выдаткаваныя на куплю ежы і харчаванне па-за домам, аплату тавараў і паслуг, астатнія — на ўклады і зберажэнні, падаткі, узносы і іншыя плацяжы, выдаткі на ўласную гаспадарку. Пры гэтым павялічылася доля ўкладаў і зберажэнняў з 9% у І паўгоддзі 2009 г. да 11,4% у І паўгоддзі 2010 г. Амаль палова (47,8%) сем'яў Мінска штомесяц мела ў сваім распараджэнні ў сярэднім на чалавека да 800 тыс., 30% — ад 800 тыс. да 1,2 млн., 22,3% — больш за 1,2 млн.

**МБ; «Еўрарадыё», БЕЛТА**

# Адключылі ўнітаз

**Ад новых метадаў барацьбы з неплацельшчыкамі за кватэру пакутуюць суседзі.**

Якіх толькі метадаў не прыдумвалі для змагання з вінаватымі за камуналку! Прыдумалі новы — адключэнне каналізацыі.

Без святла і газу пражыць можна, без вады — складаней. А вось без туалета.... Журналіст «НН» адправіўся ў госці да сям'і, якой адключылі прыбіральню.

Звычайны дзевяціпавярховік на вуліцы Жудро, шосты паверх. Дзвярэй ніхто не адмыкае — нават вырушэння няма.

Суседзі кажуць: ці пайшлі ў краму па алкаголь, ці спяць.

— У іх тут весела. Мы даўно іх не бачылі цвярозымі. Бывае, спяць ля ліфта, даводзіцца пераступаць.

Аб праблемах гэтай кватэры ведае ўвесь пад'езд.

— Спачатку ім святло адключылі — яны па вечарах пілі ў пад'ездзе, тут лямпачка ёсць. Так што ім няма розніцы, дзе піць. Пасля газ — дык яны і так не варылі есці. А вось цяпер каналізацыю.

— І што, да вас пайшлі?

— Не, да нас не ходзяць. Яны выкарыстоўвалі смеццеправод. Але мы іх паганялі, і яны цяпер сыходзяць кудысьці — на вуліцу хіба што. Дзякуй богу, пад'езд прапахнуць не паспеў.

На паўторны званок у дзверы ніхто не адказвае.

Як бачым, некаторыя грамадзяне могуць абыходзіцца без прыбіральні, а пакаранне для іх ператвараецца ў кару для ўсяго астатняга пад'езда.

Дырэктар унітарнага прадпрыемства «Гарадская аварыйная служба» Віктар Каралёў кажа, што ўсяго ў Мінску цяпер адключаны ад каналізацыі 38 кватэр. А вось расплаціліся за паслугі пасля пагрозы адключэння каналізацыі сотні гаспадароў. У Першамайскім раёне адключылі каналізацыю ў адной кватэры, дык гаспадар праз паўгадзіны разлічыўся.

З вось антысанітарыя, якая ўтвараецца ў кватэрах з адключанай каналізацыяй, гэта ўжо падстава для ЖЭСа, каб падаваць на іх у суд.

Таму камунальнік мяркуе, што новы метад уздзеяння на няплатнікаў эфектыўны і патрэбны.

**Юрась Ускоў**




**Беларускія камунальнікі скралі ідэю ва ўкраінскіх.**

# У Польшчы ў жудаснай аўтакатастрофе загінулі пяць беларусаў



Пяць чалавек, якія ехалі на двух мікрааўтобусах Mercedes-Benz Sprinter з беларускімі рэгістрацыйнымі нумарамі, загінулі 15 верасня ў Польшчы ў выніку сутыкнення з фурай у раёне вёскі Радулі за 30 км ад Беластока, на дарозе Беласток —Варшава.

Па інфармацыі генконсульства, адзін з мікрааўтобусаў быў зарэгістраваны ў Гродзенскай вобласці, другі — у Мінскай. Польскія СМІ паведамляюць, што раненні ў аварыі атрымалі пяць чалавек, двое з якіх ад шпіталізацыі адмовіліся.

Паводле папярэдняй інфармацыі, аўтобусы адзін за адным ехалі з Беластока ў напрамку Варшавы. Адзін з аўтобусаў абганяў другі. У гэты момант па сустрэчнай паласе рухаўся грузавік Volvo. Кіроўца фуры паспрабаваў пазбегнуць сутыкнення, але ўсё ж зачапіў мікрааўтобус, і той зляцеў на левую ўзбочыну. Пасля першага сутыкнення фура выехала на сустрэчную паласу, дзе пратараніла другі беларускі бус.

Паводле польскіх СМІ, участак дарогі, дзе адбылася трагедыя, мае дрэнную славу. Абгон на тым участку забаронены.

У ДТЗ загінулі пяць грамадзян Беларусі: двое мужчын (1967 і 1979 года нараджэння) і тры жанчыны (1958, 1959 і 1964 года нараджэння).

У мікрааўтобусе з гродзенскімі нумарамі знаходзіліся чатыры жыхары Гродна, усе яны загінулі. У другім аўтамабілі, з нумарамі Мінскай вобласці, знаходзіліся пяць жыхароў Салігорска. Там загінула адна пасажырка.

Двое пацярпелых — мужчына і жанчына — знаходзяцца ў бальніцах Беластока. Мужчыну — кіроўцу аўтобуса з Салігорска — зрабілі аперацыю. «Жыццю абаіх пацярпелых нічога не пагражае», — сказаў прэс-аташэ пасольства.

Прэс-аташэ Генеральнага консульства Беларусі ў Беластоку Аляксей Зелянко звярнуў увагу на тое, што «ўдзел у адным ДТЗ двух беларускіх аўтобусаў — трагічнае супадзенне». «Яны не ехалі разам і праходзілі пагранічны кантроль у розны час», — патлумачыў прэс-аташэ.

**Сямён Печанко**

## Здарэнні сцісла

• **Два гады за трыццаць соснӑў.** У турму трапіць 45-гадовы Віктар Кандратовіч, ляснік Ашмянскага лясніцтва, які за трыста тысяч хабару дазволіў высечы каля 10 кубаметраў дзелавой драўніны. Хвоі высек кліент лесніка Алег Віткоўскі ў лесе недалёка ад вёскі Талоцішкі.

• **Дзве машыны збілі школьніцу.** Трагедыя адбылася ў горадзе Узда. Вучаніца 9 класа ў прыцемку пераходзіла дарогу па нерэгуляваным пешаходным пераходзе. Яе збіў легкавы аўтамабіль «Ровер», пасля чаго дзяўчыну адкінула на сустрэчную паласу, дзе на яе наехаў «Форд». Школьніца памерла на месцы. У ДАІ адзначылі, што кіроўцам трэба быць асабліва пільнымі паблізу пешаходных пераходаў. А пешаходы павінны пераканацца, што іх прапускаюць, перш чым ступаць на «зебру».

• **У карэліцкім шпіталі распылілі газ.** Пацыенты раптам адчулі прысутнасць у паветры невядомага газу. Затым у персаналу шпіталя і ў пацыентаў з'явіліся прыкметы атручвання. Ратаўнікі канстатавалі — нехта распыліў газ з балончыка на лесвічным пралёце між 2 і 3 паверхамі. Прысутнасць газу адчувалася на калідорах і ў аддзеле рэанімацыі. Аднак газ хутка рассеяўся і праводзіць нейкія адмысловыя мерапрыемствы не спатрэбілася, — распавёў «НН» супрацоўнік МНС, які працаваў на месцы здарэння.

• **Выбух пад Слуцкам — загінулі чатыры чалавекі.** 16 верасня на прасёлачнай дарозе ля вёскі Адамава адбыўся выбух. У выніку загінулі чатыры рабочыя лесанарыхтоўчага прадпрыемства. Раней адзін з загінулых знайшоў у лесе снарад, прынёс яго ў брыгаду. Боепрыпас збіраліся разабраць. З якой мэтай — невядома. На месцы здарэння былі знойдзеныя парэшткі толькі трох загінулых. Вышукі чацвёртага працягваюцца і сёння. Паблізу ад месца здарэння былі знойдзеныя яшчэ два снарады. Іх абясшкодзілі мінёры.

• **Нелегальным перагоншчыкам пагражае турма.** У Мінску затрыманыя два браты, якія займаліся нелегальным перагонам аўтамабіляў з Германіі. Яны прывозілі ў асноўным дарагія машыны марак «БМВ», «Мерсэдэс», «Фольксваген» і афармлялі на сваякоў. Ужо вядома пра дзясятак фактаў. Злачынцы зарабілі 250 мільёнаў рублёў. Ім пагражае да пяці гадоў пазбаўлення волі.

• **Ліцэіст пакваліўся на 60 тысячаў рублёў.** 80-гадовая бабулька з вёскі Кавалёва Мёрскага раёна паскардзілася ў міліцыю, што два невядомыя хлопцы, разбіўшы шыбу, залезлі ў хату і адабралі ў яе грошы і прадукты. Рабаўнікі не надта разбагацелі на сваім злачынстве — грошай у бабулькі аказалася ўсяго 60 тысячаў рублёў. Адным з рабаўнікоў быў 18-гадовы навучэнец ліцэя, супраць яго завялі крымінальную справу.

• **Скутарыст загінуў пад фурай.** Трагедыя ў Мінску: 22-гадовы кіроўца скутара, не ўтрымаўшы раўнавагу, упаў са скутара на левую паласу, дзе ў той момант ехала фура. Трапіўшы пад кола 3-тоннага аўтамабіля, хлопец загінуў на месцы. Паводле папярэдніх звестак, ніхто з кіроўцаў правілаў не парушаў.

• **Выбух на палігоне — пацярпелі чатыры салдаты.** На адным з вайсковых палігонаў падчас падрыхтоўкі тактычнага поля да стрэльбаў адбыўся адвольны выбух. Траўмы рознай ступені цяжкасці атрымалі чацвёра вайскоўцаў. Іх жыццю нічога не пагражае.

• **Жыхар Іванаўскага раёна падазраецца ў забойстве двухгадовай дзяўчынкі.** Дзіця разам з маці і бабуляй пражывала ў адной з вёсак раёна. Цела мёртвай унучкі на ложку знайшла бабуля, якая прыйшла з працы. У гэты час дома знаходзілася маці дзіцяці. Экспертыза ўстанавіла, што смерць дзяўчынкі наступіла з-за траўматычнага шоку ў выніку пералому рэбраў, разрываў ныркі і печані. Затрыманы 25-гадовы мясцовы жыхар, рабочы сельгаспрадпрыемства, які ў гэты дзень прыходзіў у госці да маці дзяўчынкі. Маці не замужам. Гэта яе першае дзіця. Загінулая дзяўчынка — інвалід 2-й групы, у яе быў ган сэрца.

• **Пацыенты гомельскай бальніцы знайшлі ў талерках ртуць.** Выклікаlen работнікі МНС сабралі небяспечны метал — усяго больш за 1 г. Высветлілася, што ў сухасмажнай шафе трэснула колба ртутнага тэрмометра.

• **Прадпрымальнік заснуў у казіно і страціў 1800 даляраў.** 47-гадовы намеснік дырэктара аднаго з прыватных прадпрыемстваў, выпіўшы, заснуў ля гульнёвага аўтамата. Малады чалавек выцягнуў з кішэні яго кашулі 1800 даляраў. Злодзея затрымалі на падставе дадзеных сістэмы відэаназірання, усталяванай у казіно.

**СМ**

# ДжамахЕрыя беларускае дыпламатыі

**Сайты дзяржаўных органаў поўныя памылак — грубых або смешных. Піша Сяргей Богдан.**

Часам хібнае напісанне назваў замежных дзяржаў прымушала задумацца над магчымым падтэкстам перайначвання. Вось, адшліфаваны да немагчымасці сайт кіраўніка Беларусі ў адным з паведамленняў называе Лівію «Ливийская Арабская ДжамахЕрия».

Іарданіі не пашанцавала болей. У яе назве ў адным з паведамленняў МЗСаўцы зрабілі аж дзве памылкі. «Иорданское ХОшЕмитское Королевство».

Краіны воляй беларускіх службоўцаў не толькі пераназываюцца, але і перасоўваюцца ў прасторы. Генадзь Навіцкі называе Індыю «адным з найаўтарытэтных партнёраў нашае краіны ў **Паўднёва**-Усходняй Азіі», хаця краіна гэтая размешчаная ў Паўднёвай Азіі.

Што ўжо казаць пра людскія імёны. МЗС ператварыў кабету-міністра турызму Амана ў мужчыну, памяняўшы арабскі «бінт» (дачка) на больш вядомы яму з фільма «Хатабыч» тэрмін сваяцтва «бен» (сын) у імені, выйшла «Раджа **бен** Абдуламир бен Али» са слушнай лацінскай транслітарацыі «Rajha **Bint** Abdulameer Bin Ali». Так бы мовіць, замест «Раджа Абдуламіраўна» — «Раджа Абдуламіравіч».

Сайт савета рэспублікі настойліва паведамляе пра сустрэчу Чаргінца з іранскім парламентарам «Алаеддином Бр**о**уджерди», які насамрэч завецца **Бар**уджэрдзі.

Такая карціна на афіцыйных старонках сеціва сведчыць не толькі пра непісьменнасць, але і пра яе талеранцыю — многія знойдзеныя намі памылкі стаяць там гадамі — і нават абыякавасць. Разам з тым, калі людзі не могуць даць рады з вызначэннем імені суразмоўцы і партнёра, дык пра што сур'ёзнейшае яны могуць дамовіцца?

І гэта не «памылкі друку». Афіцыйныя паведамленні вывяраюцца неаднаразова чыноўнікамі перад іх абнародаваннем. Любыя памылкі ў інтэрнэце выпраўляюцца імгненна, у адрозненне ад папяровых выданняў. Таму спатканае намі непісьменства падаецца хутчэй нармалёвай практыкай, чымся выпадковасцю.

Дарэчы, праблема, магчыма, існуе не толькі з краінамі, што развіваюцца. Падчас ліпеньскага візіту ў Беларусь Вярхоўнага камісара ААН па справах уцекачоў партугальца Антоніу Гутэрыша прэсавая служба МЗС таксама не паруплілася высветліць, як жа таго завуць, задаволіўшыся іспанізаваным варыянтам «Антонио Гутеррес». Між тым, ААНаўскія матэрыялы заўжды падкрэсліваюць слушнае напісанне яго імя па-расійску. Але дзеля гэтага беларускі МЗС ці іншыя ўстановы мусілі б іх, прынамсі, чытаць...

# «Ой, колькі ж крыві ў Лідзе будзе...»

Як вядома, «Дажынкі», ці «белорусский праздник урожая», як выражаюцца расійскія СМІ, будзе ў гэтым годзе праходзіць у Лідзе. Гарадскія ўлады, як заўжды, не паспяваюць падрыхтавацца і па старой добрай традыцыі знішчаюць які-небудзь помнік гісторыі (на гэты раз не пашанцавала магіле ксяндза-паўстанца 1863 г. Адама Фалькоўскага, на месцы якой паклалі прыгожую краснасельскую плітку — старонка 11). Аднак размова не пра гэта.

13 верасня ў інтэрнэце з'явілася відэа з нібыта былым прадстаўніком расейскіх спецслужбаў, які паабяцаў беларускім уладам серыю дыверсій і тэрактаў напярэдадні выбараў. Асобным пунктам у гэтым спісе значыцца «масакра» падчас «праздника урожая». Бестселерам гэтае відэа калі і стала, то на кароткі час.

Але якім жа было маё здзіўленне, калі ў той жа дзень давялося пачуць звесткі пра «крывавае свята» з вуснаў абсалютна незаангажаваных і абыякавых да палітыкі людзей, працаўнікоў дзяржаўных установаў. І тут пачалося самае цікавае.

Першай версіяй з'явілася нібыта прароцтва Вангі наконт гібелі беларускага лідара восенню 2010 года на захадзе Беларусі. У гэтым прароцтве была нават канкрэтная дата, даведаўшыся пра якую, улады перанеслі святкаванне на пазнейшы час. Далей — цікавей.

Зусім не ў Балгарыі, а ў нас пад носам быццам меў месца такі выпадак. Жанчына вырашыла падабраць аднаго «дзядусю» на шашы. А той вазьмі і папярэдзь яе, каб не брала болей спадарожнікаў (вось ужо дзіўная просьба). Жаласлівая жанчына ўжо мела дамову са знаёмым падкінуць яго на зваротным шляху, ды той да пункта прызначэння не даехаў — памёр. А вось дзядок, выходзячы з машыны, на развітанне прамовіў: «Ой, колькі ж крыві ў Лідзе будзе, колькі крыві...»

Механізм стварэння фантастычных чутак сярод народа — з'ява, безумоўна, цікавая. І нараджаюцца яны, пэўна, з глыбінных слаёў чалавечай свядомасці — няздзейсненых жаданняў, спадзяванняў, замешаных на таямнічасці з элементамі фантастыкі, прычым зусім не навуковай.

Напрыклад, жыхары паўночна-заходняй часткі Гродзенскага раёна ў пасляваенныя гады з вуснаў у вусны перадавалі легенду пра амерыканскія падводныя лодкі, што ўсплываюць у адным мясцовым возеры. Настолькі тут моцным быў дух антысаветызму і спадзяванні на дапамогу з Захаду.

Які ж дух і якія спадзяванні фармуюць чуткі пра «крывавае свята» ў Лідзе — вырашайце самі.

**Алесь Кіркевіч, Гродна**

# Падтрымаўшы Кастусёва, Мілінкевіч згуртуе нацыянальныя сілы

Піша **Павал Мажэйка**.

Варыянт, пры якім Аляксандр Мілінкевіч не возьме ўдзелу ў гэтай прэзідэнцкай кампаніі, надзвычай дрэнны. Гэта варыянт, які азначае, што беларуская правыя, нацыянал-дэмакраты, не будуць мець свайго выразнага кандыдата. Ужо толькі наяўнасць якога сведчыла б пра іх моц, еднасць і пра перспектыву той Беларусі, дзеля якой яны станавіліся апазіцыянерамі апошнія 20 гадоў.

Але Мілінкевіч мае права адмовіцца балатавацца на выбарах прэзідэнта. У яго як палітыка ёсць аргументы на карысць такога ці іншага рашэння.

Сёлета да прэзідэнцкай кампаніі нацыянальныя сілы падышлі некалькімі кволымі калонамі. Сітуацыю можна лічыць драматычнай. Нават стаіць пытанне, ці перажывуць гэтую кампанію правыя ў якасці палітычнай сілы, ці не страцяць рэшткі ўплыву не толькі на грамадства, але і ў самой апазіцыі. І таму Аляксандр Мілінкевіч не павінен сабе дазволіць проста заявіць пра выхад з кампаніі, падпарадкаваць гэтае рашэнне толькі інтарэсам сваёй структуры, распыліць зароблены аўтарытэт і рэйтынг. Мілінкевіч не мае права пакінуць нацыянальныя сілы без выразнага кандыдата.

Іначай гэтая кампанія можа надоўга пахаваць памкненні беларускіх правых быць сілай, здольнай абараняць нацыянальныя інтарэсы Беларусі. Ці, прынамсі, змушаць нашы ідэалагічна стракатыя дэмакратычныя сілы займаць цвёрдую пазіцыю адносна дачыненняў з Расіяй ці еўрапейскага вектара Беларусі.

Лёс нацыянальных сілаў залежыць і ад таго, як Мілінкевіч разыграе сваю карту, што ён зробіць са сваім палітычным даробкам.

Падтрымаць усіх ці падтрымаць некалькіх — гэта не падтрымаць нікога. У сваю чаргу



**Павал Мажэйка**
у 2005—2007 прэсавы сакратар Аляксандра Мілінкевіча.



**На сваёй родавай сядзібе ў Берштах Мілінкевіч (другі злева) сабраў прабеларускіх кандыдатаў у прэзідэнты: Алеся Міхалевіча ад Саюза за мадэрнізацыю, Юрыя Глушакова ад Партыі зялёных ды Рыгора Кастусёва ад Партыі БНФ.**

складанае, але лагічнае, паслядоўнае рашэнне аб перадачы свайго даробку аднаму кандыдату будзе азначаць фактычна прызначэнне адзінага кандыдата ад нацыянальных сіл. З адпаведнымі наступствамі: легітымнасцю, распазнавальнасцю, аўтарытэтам як унутрыбеларускім, так і міжнародным.

На прэзідэнцкіх выбарах мы даўно не выбіраем прэзідэнта. З гэтым неабходна лічыцца. Таму развагі, якому кандыдату ад апазіцыі аддаць перавагу — высокаму, маладому, падабаецца дзяўчатам ці не, цягне ці не цягне быць прэзідэнтам, — маюць значэнне хіба толькі на семінарах па PR.

Мы выбіраем — ці захаваюць нацыянальныя сілы лідарства ў апазіцыі і ці будуць яны здольныя ў бліжэйшай перспектыве пазмагацца за змену ўлады ў Беларусі.

Безумоўна, жадаць перамогі над Аляксандрам Лукашэнкам неабходна кожнаму апазіцыйнаму кандыдату, які ідзе сёння на выбары, незалежна, як кажуць, ад партыйнай прыналежнасці. Не іначай, каб пасля гэтых выбараў працягвалася вайнушка, каму несці сцяг прабеларускіх праеўрапейскіх правых сіл.

Мілінкевіч мае магчымасць зблізіць нацыянальныя сілы. І такім жэстам можа стаць ягоная падтрымка на выбарах Рыгора Кастусёва, кандыдата ад Партыі БНФ.

Чаму Кастусёў? Бо гэта кандыдат ад найбольш масавай, арганізаванай, зматываванай правай структуры.

Гэты палітык мае права быць на выбарах кандыдатам і надзеяй большасці тых грамадзянаў краіны, якія вызнаюць згаданыя вышэй вартасці.

Мілінкевіч будзе паслядоўным, калі са сваім досведам, з аграмадным міжнародным аўтарытэтам стане на гэтых выбарах поплеч з абсалютна новым у публічнай палітыцы Рыгорам Кастусёвым.

Па меншай меры, гэтая падтрымка верне ўзаемны давер у адносіны і зробіць дзве структуры, якія стаяць на нацыянальных пазіцыях — Рух «За Свабоду» і Партыю БНФ, — саюзнікамі не толькі на бліжэйшую кампанію. А гэта ўжо база для рэальнага аб'яднання.

## Пазняк: Без нацыянальнага сеціва няма нацыі

Мы, беларусы, павінны ўсвядоміць і зразумець карэктывы, якія ўнесла развіццё прагрэсу ў вызначэнне асноўных атрыбутаў існавання нацыі. У XIX—XX стагоддзях імі былі літаратура, тэатр, нацыянальная сістэма адукацыі. З другой паловы XX стагоддзя сюды дадалося яшчэ тэлебачанне. У будучыні атрыбутам нацыі можа стаць інтэрнэт, нягледзячы на ўсю яго глабалісцкую прыроду, і словы «без нацыянальнага сеціва няма нацыі» могуць стаць цалкам рэальнымі.

Мусіць [таксама] ставіцца пытанне аб вяртанні нацыянальнага беларускага тэлебачання. Усё, што кажуць дыктары на нацыянальным тэлебачанні, прамаўляецца па-беларуску, журналісты працуюць па-беларуску, і толькі грамадзяне, асобы, у якіх бяруць інтэрв'ю і інш., гавораць на той мове, якую ведаюць ці на якой хочуць.

Нацыянальнае тэлебачанне і радыё — гэта тыя асяродкі і тыя з'явы, якія ўтрымліваюць нацыю ў адчуванні моўнага і культурнага адзінства, у прылучанасці да свету і да грамадства, істотна спрыяюць у веданні і засваенні роднай мовы.

**Радыё «Свабода»**

## З пошты рэдакцыі

### Хадзіце да людзей, ці Зварот да кандыдатаў

**З Аляксандрам Рыгоравічам, па вялікім рахунку, усё ясна, і малаімаверна, што ў будучых выбарах ён будзе дзейнічаць неяк інакш, чым у папярэдніх.**

Гаворка больш пра дзеянні кандыдатаў «апроч».

Згадваецца найцікавы фільм па рамане Роберта Уорэна — «Уся каралеўская раць», — зняты ў 2006 годзе. І найцікавы герой Шона Пэна — Вілі Старк. Як ён імкнуўся да вяршыні? Ён размаўляе з людзьмі ў полі, з рыбакамі ў гавані, на заводах і фабрыках... І дамагаецца сваёй мэты!

Дык, спадары прэтэндэнты, хадзіце да людзей!

**Міхась Карпешка**

# Маніякальная надзея знайсці адзінага

Круглы стол з кіраўнікамі передвыбарчых штабоў у рэдакцыі «Нашай Нівы».

Круглы стол з прадстаўнікамі перадвыбарчых штабоў будучых кандыдатаў у прэзідэнты адбыўся 18 верасня ў рэдакцыі «Нашай Нівы».

Прысутнічалі тры прадстаўнікі кандыдатаў: начальнік штаба Рыгора Кастусёва Аляксей Янукевіч, начштаба Уладзіміра Някляева Андрэй Дзмітрыеў і Анатоль Лябедзька, лідар Аб'яднанай грамадзянскай партыі, што вылучыла Яраслава Раманчука. Прысутнічалі таксама эксперты: эканамісты і палітолагі Сяргей Чалы, Юры Чавусаў і Віталь Сіліцкі.

**Віталь Сіліцкі:** Чацвёртая перадвыбарчая кампанія у Беларусі, трэцяя пры Лукашэнку, ёсць з чым параўноўваць.

Першая тэндэнцыя, якую заўважу, — шырокі ўдзел палітычных партый (кампанію «Гавары праўду» я разглядаю як палітычную сілу).

Другое — адсутнасць супольнага сцэнара: у 2001 годзе спрабавалі паўтарыць югаслаўскі варыянт з мадыфікацыямі, у 2006 годзе — каляровы варыянт. Цяпер нейкага відавочнага варыянта няма: альбо «скачам» старыя, сыходзячы з папярэдняга досведу, альбо спрабуем штосьці імправізаваць.

Трэцяе — разнабой кандыдатаў. Адна з праблемаў, што няма такога адзінага — спробы аб'яднання нічым не скончыліся — і ёсць пэўнае расчараванне ў супольных дзеяннях.

І яшчэ адна тэндэнцыя — змена пакаленняў у палітыцы. На жаль, мы жывём у такой сітуацыі, што для людзей, якія займаюцца па 15 гадоў палітыкай, няма іншага развіцця, як ісці кандыдатам на большыя пасады.

Пытанне, колькі штабоў з тых, хто стартуе, рэальна змогуць сабраць подпісы?

**Юрый Чавусаў:** Гэта пакажа праца. Адзіны кандыдат можа і зашкодзіць у чымсьці эфектыўнай працы з грамадствам.

**Аляксей Янукевіч:** Адзіны кандыдат патрэбны Захаду, каб яны ведалі, з кім тут размаўляць, і наменклатуры, каб яна ўмоўна ведала, што весці перамовы патрэбна з гэтымі, а не бегаць паміж штабамі. Ці імкнемся мы да той аксіёмы, што разлічваем толькі на Захад і наменклатуру?

Калі мы разлічваем на народ, то я перакананы, што для народа і для тых, хто не вызначыўся, патрэбны не адзіны, а кандыдат з яснай праграмай будучыні Беларусі. Не кандыдат, які будзе казаць: «Я за дэмакратыю, а пасля мы ўсе разбяромся». Не спрацоўвае гэта. 2006 год гэта яскрава паказаў. Для Плошчы некалькі кандыдатаў лепш — бо кожны кандыдат мабілізуе і прыводзіць сваіх прыхільнікаў.

Няма адзінага кандыдата — гэта супер, нарэшце у нас тут барацьба ідэяў, а не барацьба лузераў за другое месца.

**Сяргей Чалы:** Наўрад ці хтосьці будзе спрачацца, што гэтыя выбары — рэдкі шанец, калі перамога магчыма. Я ўпэўнены — тэхналагічна перамагчы магчыма.

Мяне заўсёды здзіўляла маніякальная настойлівасць выбару адзінага. Парадаксальна, што дэмакратычныя сілы часам рабілі абсалютна недэмакратычныя крокі, каб атрымаць гэтага адзінага. Да гэтага ў нас былі кандыдаты «ні пра што», супраць усяго дрэннага за ўсё добрае.

**Віталь Сіліцкі:** Уявіце сабе, што ваш кандыдат не збярэ подпісы, вашы дзеянні?

**Андрэй Дзмітрыеў (прадстаўнік штаба У.Някляева):** Мне падаецца, што нават Лукашэнка ўпэўнены, што мы збяром 100 тысяч. Я тут не буду ўяўляць іншага. Мы збіраем 100 тыс., мы ў гэтым упэўнены. Ёсць структура, якая працуе, мы даказалі гэта на працягу 6 месяцаў.

Калі мы ў штабе вырашаем, з кім дамаўляцца, то гаворка ідзе пра 3-4 чалавекі. Калі ў іх і няма магчымасці сабраць 100 тыс. подпісаў, але ў іх ёсць імідж і піяр станоўчы, з імі трэба будзе дамовіцца. Таму я не лічу, што некалькі кандыдатаў — гэта дрэнна ці добра, гэта рэчаіснасць. Калі ў кампаніі «ад дзвярэй да дзвярэй» да чалавека прыйдуць прадстаўнікі некалькіх кандыдатаў і нагадаюць пра выбары — гэта будзе толькі плюс.

Мы ўпэўнены, што патрэбна збірацца з кандыдатамі і абмяркоўваць сцэнары. Першая сустрэча патрэбна пасля рэгістрацыі ініцыятыўных груп, дзе мы збяромся і дамовімся пра простыя рэчы, што мы «ўсе ў адной лодцы» і не працуем адзін супраць аднаго.

Другое, мы ўжо зараз павінны размаўляць пра Плошчу.

**А.Янукевіч:** Мы дакладна ўсё разлічылі і ведаем, што збіраем 100 тыс. подпісаў. Гіпатэтычную магчымасць іншага варыянта мы выключаем. Мы лічым, што чым бліжэй да даты выбараў, тым болей будуць фармавацца два цэнтры, флангі: Някляеў і Кастусёў.

Каардынаваць дзеянні, безумоўна, патрэбна. Бліжэй да выбараў будзем сустракацца і гаварыць. Але ў нас ёсць адрозненні ў бачанні ролі Расеі, дакладней — якую ролю Крэмль можа адыграць падчас гэтых выбараў.

**Анатоль Лябедзька:** Пытанне рытарычнае. Нават Глушакоў скажа, што збярэ 100 тыс. подпісаў. Я на гэта пытанне не буду адказваць. Скажу іншае: у нас і яшчэ аднаго кандыдата будуць самыя вялікія праблемы рэгістрацыі.

Моцнае месца адзінага кандыдата, калі ён вырашаны загадзя, то мы навязваем уладзе свайго кандыдата для рэгістрацыі. Калі яго няма, як сёння, то мы дэвальвуем на палітычнага лідара, які мог бы ўзяць на сябе адказнасць. На сённяшні дзень ад таго, сабраў ты 100 тыс. подпісаў ці не, рэгістрацыя не залежыць.

У спісе зарэгістраваных могуць аказацца не тыя, хто сабраў 100 тыс. подпісаў і валодае патэнцыялам, а каго выбрала ўлада.

**Андрэй Дынько:** У чым вы бачыце самае слабае месца Лукашэнкі і як вы будзеце па ім біць?

**Аляксей Янукевіч:** У Лукашэнкі, на маю думку, куча слабых месцаў. Самае слабае — абарона нацыянальных інтарэсаў. Ён не мае ясных адказаў на тыя выклікі, якія ён зараз атрымлівае ад Крамля.

**Андрэй Дзмітрыеў:** Першае, стомленасць проста ад персоны: не важна, быў ён добрым прэзідэнтам ці не. Другое, што ён страціў магчымасць дамаўляцца. Раней ён мог праўдамі і няпраўдамі паехаць і ў Еўропу, і ў Расею дамовіцца. Цяпер ён не можа дамовіцца ні з кім.

Гэта слабы бок, па якім мы можам біць і мы будзем паказваць, што Някляеў — гэта чалавек, які можа дамаўляцца. Не заменіць Лукашэнку ў тым, што дамаўляцца можна толькі з Крамлём. Мы пакажам, што мы можам існаваць тут і дамаўляцца з Еўропай і дабівацца таго, што нам патрэбна.

**Анатоль Лябедзька:** Гэта стары твар, ад якога ўсе стаміліся. Тут нам дастаткова лёгка працаваць з Раманчуком, якога можна лёгка пазіцыянаваць як новы твар.

Другое, гэта крызіс і эканоміка. Улада не спраўляецца з гэтымі праблемамі, яна не дэманструе, што яна кіруе сітуацыяй. Зноўку ў нас тут добрае пазіцыянаванне, бо эканаміст тут больш трапляе у чаканні людзей, чым палітык. Трэцяе слабае месца, я б назваў расійскі складнік. Што б ні гаварылі, але працоўны МАЗа і наменклатура будуць рэагаваць на перспектывы жыцьць добра ці дрэнна і якія адносіны з Расіяй.

**Віталь Сіліцкі:** Ёсць адчуванне, што за 10 год кола пытанняў, якія мы абмяркоўваем, не мяняецца. Можа, гэта і нармальна. Гэта як ляжыць у лядоўні рыба, калі яна замарожана да мінус 30, яна можа праляжаць і 10 гадоў, пакуль штосьці не пачне мяняцца і таяць. Можна сачыць і за рыбай, але трэба сачыць за лядоўняй. Штосьці падобнае з нашай краінай. Нас кінулі ў лядоўню, краіна замарожана, у нас абмежаваны магчымасці. Але штосьці пачало мяняцца, лядоўня пачала мяняцца. Таму сітуацыя нармальная, што мы 10 гадоў пра адно і тое размаўляем, як у той замарожанай лядоўні.

Я пакідаю за сабой пакінуць права на ўласнае меркаванне: пакуль Лукашэнка зможа захоўваць занятасць на дзяржаўных прадпрыемствах, скінуць яго будзе практычна немагчыма.

**Запісала Настасся Шамрэй**

## Лукашэнка павіншаваў Петрасяна з народзінамі, аднак праігнараваў Мядзведзева

16 верасня кіраўнік Беларусі павіншаваў народнага артыста РСФСР Яўгенія Петрасяна з 65-годдзем, паведамляе яго прэс-служба. Навіна была б не вартая ўвагі — беларускі лідар многа каго віншуе, нават нядаўна Ларысу Доліну з юбілеем, — каб не адна дэталь.

Два дні таму Лукашэнка (ці яго прэс-служба) абмінулі ўвагай 45-годдзе прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева. Прынамсі, на афіцыйным сайце пра гэта няма ні слова. Гэта пры тым, што 14 верасня, у дзень народзінаў Мядзведзева, Лукашэнка выказаў спачуванні прэзідэнту Венесуэлы ў сувязі з авіякатастрофай, і павіншаваў прэзідэнта Турцыі Абдулу Гюля з вынікамі агульнанацыянальнага рэферэндума.

13 верасня павіншаваў з 75-годдзем прэзідэнта Міжнароднай асацыяцыі дзіцячых фондаў Альберта Ліханава, а 15 верасня — вядомага беларускага будаўніка Мікалая Ашэйчыка з 70-годдзем.

Павіншаваў Лукашэнка з народзінамі і апальнага на сёння ў вачах расійскага кіраўніцтва мэра Масквы Юрыя Лужкова.

Нават ва ўмовах інфармацыйнай вайны Беларусі з Расіяй невіншаванне лідара суседняй дзяржавы, найбольшага эканамічнага партнёра, на фоне вітанняў Долінай і Петрасяну, глядзіцца загадкава. Праўда, Мядзведзеў таксама не віншаваў Лукашэнку з ягоным днём народзінаў. Беларускі кіраўнік ужыў прынцып «вока за вока».

**Алег Гардзіенка**

## З'явіўся кандыдат Іваноў

Загадкавы Сяргей Іваноў абвесціў пра свой намер балатавацца праз інтэрнэт.



Гэты чалавек заявіў пра свае прэзідэнцкія амбіцыі толькі на сваім сайце, прычым датай публікацыі стаіць 01.07.2020 года. Аднак Сяргей Іваноў заклікае «не паддавацца на песімізм і правакацыі» і запісвацца ў яго ініцыятыўную групу.

«Прапаную рэальны, адрозны ад іншых, шлях развіцця Беларусі — фарманне Грамадзянскай Супольнасці, — піша на сваім сайце Сяргей Іваноў. — Я супраць паслаблення ўлады на другім этапе развіцця, я за пераемнасць улады».

Іваноў лічыць абавязковым, каб беларусы ведалі сваю родную мову і карысталіся ёй: «Рэанімацыя беларускай мовы павінна адбывацца кожны дзень, але натуральным чынам, упэўнена, плаўна, паэтапна, з удзелам прафесіяналаў».

Нарадзіўся гэты Іваноў у 1971 годзе ў Мінску. У 1989 годзе скончыў сярэднюю школу №3 сталіцы. У гэтым жа годзе паступіў у Тамбоўскае вышэйшае вайсковае авіяцыйнае інжынернае вучылішча. У 1994 годзе скончыў навучанне па спецыяльнасці радыётэхніка з прысваеннем кваліфікацыі радыёінжынера і вярнуўся да сябе на радзіму ў Беларусь для далейшага праходжання службы.

З 1994 года па 2004 год праходзіў службу ў сілавых структурах Рэспублікі Беларусь. Звольніўся па ўласным жаданні. З 2004 года працаваў намеснікам дырэктара ў камерцыйнай арганізацыі. Лічыць такі вопыт дастатковым, каб узначаліць дзяржаву.

**Наста Шамрэй**

## Ініцыятыўныя групы

**Юрый Глушакоў**

Т.: (029) 610–67–20, (029) 707–36–78.

**Рыгор Кастусёў**

Электронны адрас: press@narodny.org.

Мінск — Вадзім Канапацкі, т.: (029) 750–16–79.

Мінская вобласць — Аляксей Сюдак, т.: (029) 870–32–23.

Брэсцкая вобласць — Зміцер Шыманскі, т.: (029) 660–57–41.

Віцебская вобласць — Кастусь Смолікаў, т.: (044) 788–52–45.

Гродзенская вобласць — Вадзім Саранчукоў, т.: (029) 654–05–34.

Гомельская вобласць — Валер Пуцікі, т.: (029) 351–79–78.

Магілёўская вобласць — Зміцер Салаўёў, т.: (029) 691–59–63.

Альбо звярнуцца ў цэнтральны офіс Партыі БНФ: тэлефон (017) 284–50–12, г. Мінск, пр. Машэрава, 8, офіс Партыі БНФ.

**Алесь Міхалевіч**

Электронная пошта: i@mihalevich.by, team@mihalevich.by скайп: amichalevic, т.: (029) 146–47–94, (029) 169–48–11.

**Уладзімір Някляеў**

Мінск: zapraudu.minsk@gmail.com, zapraudu.info@gmail.com, т.: (029) 525–64–84.

# «Я прыняў рашэнне. Перамагчы і стаць прэзідэнтам»

**Лідар кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў ідзе на выбары.**

Пра гэта паэт заявіў 16 верасня ў «Паціа Піцы». Ён гаварыў па-беларуску, у тым ліку і з расійскімі журналістамі. Што праўда, на афіцыйным сайце кандыдата па-беларуску выкананы толькі ягоны подпіс.

«Я прыняў рашэнне браць удзел у прэзідэнцкай кампаніі. Прыняў рашэнне ўдзельнічаць, каб перамагчы і стаць прэзідэнтам», — пачаў сустрэчу з журналістамі Някляеў. Ён агледзеў памяшканне і папрасіў фотаапарат. «Я вас сфатаграфую зараз, а калі стану прэзідэнтам, то тыя з вас, хто мае словы пра перамогу і прэзідэнцтва сустрэў без аптымізму, у мой журналісцкі пул не трапяць», — пажартаваў паэт. Потым, праўда, ён перадасць старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанне Літвіной букет кветак да 15-годдзя арганізацыі і скажа, што без незалежнай прэсы не было б і ягонай кампаніі.

Сустрэча з журналістамі была абстаўленая як бізнэс-сняданак. На сталах прадстаўнікоў прэсы чакаў праект праграмы Някляева на 2011—2015 гады, выкананы ў выглядзе палітычнага меню. Чаму паэт пайшоў у палітыку?

Някляеў працытаваў словы Кастуся Каліноўскага з першага нумара «Мужыцкай праўды». «Што змянілася з тых часоў? Сутнасна — нічога», — канстатаваў паэт і заявіў, што краіну трэба мяняць, мяняць сістэму. Як гэта зрабіць?

«Асноўнай стравай» праграмы Някляева ідзе палітычная і канстытуцыйная рэформа. Някляеў абяцае пераход да парламенцка-прэзідэнцкай формы кіравання. «Хоць я ад пачатку быў выключна за парламенцкую форму». Лозунгам сваёй кампаніі Някляеў абраў словы «Я прыйшоў, каб вы перамаглі». Гэтыя словы былі ўключаныя ў новы верш паэта, у якім беларусы — снапы на чужым току, якія хто хоча, той і малоціць. Ён прыйшоў, каб зламаць гэты злы рок. «Бог на небе, праўда на зямлі», — дэкламаваў паэт.

«Мы ўсе кажам, што любім Беларусь. Няма падставаў не верыць, што Лукашэнка ды яго атачэнне яе не любяць. Розніца ў тым, ці баліць у іх сэрца за нашу мову, культуру. Вось у мяне баліць. Неймаверна баліць», — прызнаўся Някляеў.

Новае стагоддзе, па словах паэта, не зняло праблемы выклікаў мове і незалежнасці малых краінаў. Беларусь — не такая ўжо і малая краіна, кажа ён, але тыя выклікі ёсць і ў яе. Каб выжыць духоўна, трэба выжыць фізічна, упэўнены ён. Паэт працытаваў вынікі перапісу і акцэнтаваў увагу на скарачэнні насельніцтва. «Нас стала на паўмільёна менш. Гэта вялікі абласны горад». Ён адзначыў, што лукашэнкаўская Беларусь — не сацыяльная, а сацыялістычная дзяржава.

Галоўнай задачай Някляеў бачыць тое, каб зрабіць абсалютна немагчымым вяртанне сённяшняй сістэмы ў будучыні.

Ці можа апазіцыйны кандыдат у адзіночку перамагчы Лукашэнку? Можа, упэўнены Някляеў. На стадыі збору подпісаў стане ясна, хто здольны працягваць кампанію, а хто не. У гэты момант найбольш здольны атрымае падтрымку тых, хто з дыстанцыі сыдзе.

Калі маеш унікальны шанец, то мусіш узняцца над уласнымі амбіцыямі. Ён прыгадаў, што некалі і ў літаратуру ўварваўся, як сёння ў палітыку.

«Я разумею нашых палітыкаў. Усе яны насамрэч змагаліся ўсе гэтыя гады. А тут прыйшоў нейкі паэт і адразу да іх». Рэцэпт перамогі ад Някляева стары як свет: прыйшоў, убачыў, перамог.

Па яго словах, калі ўлады створаць усе неабходныя ўмовы для свабодных і празрыстых выбараў, ён не выйдзе на Плошчу. Калі гэтага не будзе, то Плошча з'явіцца сама сабой.

Паэт прызнаўся, што стаміўся адбівацца ад абвінавачванняў у прарасійскай дзейнасці. «Я быў і ёсць беларускім паэтам, я беларускі кандыдат і я стану беларускім прэзідэнтам», — адчаканіў Някляеў.

**Сямён Печанко**




Юлія Дарашкевіч

**Палітычнае меню ад Някляева: асноўная страва**

Парламенцка–прэзідэнцкая форма кіравання, мадэрнізацыя эканомікі ды шчыльныя адносіны з Расіяй і Еўропай.

**Асноўнымі інгрэдыентамі «сацыялкі»**

ў праекце значацца рэформа аплаты працы, удасканаленне падатковай палітыкі ў інтарэсах сям'і, стымуляванне нараджальнасці — сем'ям пры нараджэнні другога дзіцяці абяцаюць выплату $25 000.

**На расійскім кірунку**

абяцаецца «перазагрузка» адносін. На еўрапейскім накірунку Някляеў будзе дабівацца адмены санкцый ЕС у дачыненні да Беларусі, спрашчэння візавага рэжыму і г.д. Някляеў–прэзідэнт за строгае выкананне ўсіх міждзяржаўных пагадненняў з Расіяй, якія забяспечваюць адсутнасць мытных візавых абмежаванняў паміж краінамі і свабоднае перамяшчэнне грамадзян, тавараў і капіталаў. Бо «Расія для значнай часткі нашага насельніцтва — крыніца існавання».

**Любімая страва**

пытанні нацыянальнай палітыкі і свабоды веравызнання, культуры і адукацыі.

Тут абяцаецца развіццё нацыянальна–культурнай ідэнтычнасці ўсіх нацменшасцяў у спалучэнні з прыярытэтнай падтрымкай мовы тытульнай большасці. А таксама роўныя ўмовы для ўсіх канфесій. Сістэму адукацыі абяцаюць інтэграваць у агульнаеўрапейскую адукацыйную сістэму.

**І як жа без «гарчыцы»:** «Хакей пакінем хакеістам. Працаваць давядзецца ўсім».

## кандыдатаў. Кантакты

Магілёў, golaspraudy@gmail.com, т.: (044) 763–00–67.

Брэст: kovshbrest@mail.ru, тэлефон (029) 724–64–34.

**Яраслаў Раманчук**

Праз сайт партыі АГП ucpb.org, а таксама праз т.: (017) 289–50–09.

У рэгіёнах: Брэст — Марат Несцярэнка, т.: (029) 223–94–04.

Магілёў — Уладзімір Шанцаў, т.: (029) 651–77–76.

Гродна — Юрый Істомін, т.: (029) 783–37–38.

Гомель — Марат Афанасьеў, т.: (029) 628–28–50.

Мінская вобласць — Уладзімір Малярчук, т.: (029) 646–25–19.

**Віталь Рымашэўскі**

праз электронную пошту bchd.info@gmail.com, альбо праз т.: (029) 753–43–37.

У рэгіёнах: Брэст — Зміцер Шурхай, т.: (033) 698–41–27.

Віцебск — Таццяна Севярынец, т.: (029) 597–70–49.

Гродна — Мікалай Баўсюк, т.: (033) 655–52–49.

Магілёў — Таісія Кабанчук, т.: (029) 615–28–37.

Гомель — Тамара Зайцава, т.: (029) 737–76–08.

**Андрэй Саннікаў**

Т.: (029) 946–50–52, (029) 681–57–37, скайп: jauhen, электронная пошта: europeanbelarus@gmail.com.

**АП**

## Перад Аранжавай рэвалюцыяй начштаба Някляева працаваў на Януковіча

**У 2004–м ён разам з Партыяй Рэгіёнаў Украіны прайграў прэзідэнцкія выбары, а ў 2003–м з СПС не адолеў 5–працэнтавы бар'ер.**

Кіраўніком перадвыбарнага штаба Уладзіміра Някляева прызначаны Андрэй Дзмітрыеў. Вядома, што ён з'яўляецца міжнародным сакратаром Аб'яднанай грамадзянскай партыі і разам з Уладзімірам Някляевым стаяў ля вытокаў кампаніі «Гавары праўду». У часе затрыманняў іператрусаў на офісе кампаніі 18 мая быў арыштаваны на трое сутак.

Як адзначае ў сваім блогу журналістка Святлана Калінкіна, у 2004 Андрэй Дзмітрыеў трэніраваў Партыю Рэгіёнаў Украіны, а годам раней — расійскую партыю Саюз правых сілаў. (Дзмітрыеў з'яўляецца дырэктарам кансалтынгавай кампаніі.)

У абодвух выпадках яго кліентаў чакала няўдача: лідар партыі Віктар Януковіч прайграў прэзідэнцкія выбары, а СПС не перадолела 5-працэнтны бар'ер на выбарах у Думу. «Трэцяй спробай ўнесці ў палітыку прынцыпы тайм-менеджменту і правільных камунікацый пры прамых продажах Дзмітрыеў проста абавязаны выправіць палітычную частку сваёй біяграфіі», — піша Калінкіна.

На сёння Андрэй Дзмітрыеў з'яўляецца дырэктарам кансалтынгавай кампаніі «Інфа-Сталкінг», бізнес-трэнерам па тайм-менеджменце (займаецца правільнай арганізацыяй часу).

**Біяграфія дырэктара і трэнера выглядае наступным чынам:**

**Ад лютага 2005 г.** па цяперашні час — дырэктар і трэнер ТАА «Інфа–сталкінг» (непасрэднае кіраванне кампаніяй, правядзенне трэнінгаў па кіраванні працоўным часам, кіраванню часам з Outlook, дэлегаванні, арганізацыі і правядзенні перамоваў, кансультаванне, карпаратыўныя праекты па ўкараненні CRM, аптымізацыі правядзення нарад , пастаноўцы задач);

**Лістапад 2004** — трэнер і кансультант Партыі Рэгіёнаў Украіны, г. Кіеў;

**Верасень 2004** — трэнер кампаніі «Цяньшы» (тэма трэнінгаў — «Камунікацыя ў прамых продажах»);

**Ліпень — жнівень 2004** — трэнер у праекце IDEA і New Communication Club (серыя рэгіянальных семінараў на тэмы кіравання часам, арганізацыйнага будаўніцтва, камунікацыі і матывацыі);

**2004 — люты 2005** — незалежны трэнер і кансультант у шэрагу праектаў па ўкараненню CRM–сістэмы і карпаратыўнага планавання;

**Чэрвень — снежань 2003** — кіраўнік рэкламнай кампаніі па Маскоўскай вобласці для палітычнай партыі «Саюз Правых Сіл»;

**Верасень 2002 — май 2003** — выкладчык рыторыкі ў ліцэі БДУ, г. Мінск;

**З лістапада 2001 — па люты 2005** — трэнер IDEA (International Debates Educational Association).

**СП**

## Някляеў пачаў фармаванне ініцыятыўнай групы

Яе аснову складуць прадстаўнікі ўсіх рэгіянальных прадстаўніцтваў кампаніі «Гавары праўду!».

Сход адбыўся ў памяшканні офіса партыі БНФ, бо іншага месца ў сталіцы знайсці не здолелі.

На сустрэчы Някляеў заявіў, што яго штаб збярэ столькі подпісаў, колькі трэба. «На сёння ў нас у ініцыятыўнай групе 1300 чалавек. І мы пакуль не прыцягвалі новых людзей для ўдзелу ў выбарчай кампаніі. Я думаю, што ў нас будзе значна больш людзей», — паведаміў лідар «Гавары праўду!».

На сходзе пачалося фармаванне будучых органаў каманды кандыдата і вызначэнне асноўных накірункаў дзейнасці на пачатковым этапе. 23 верасня плануецца падаць у Цэнтрвыбаркам спіс удзельнікаў ініцыятыўнай групы Уладзіміра Някляева.

**Алесь Пілецкі**

# Невядомая радзіма Макея

Працяг са старонкі 1.

Даведаўшыся, што прыехалі журналісты, яна расплываецца ў шчаслівай усмешцы: «Аж з самага Мінска? Відаць, ад Валодзі нашага!» — і запрашае нас і сваю стрыечную сястру ў хату.

## Неспадзяваная чытачка «НН»

Драўляная хата цёткі Макея шаляваная і пафарбаваная ў жоўты і блакітны колеры. Унутры акуратна прыбраная — ніякага намёку на пыху ад прэстыжнага сваяцтва. Першае, што кідаецца ў журналісцкае вока, як заходзіш у хату, — газетны разварот з «Нашай Нівы»! Суседзі падзяліліся газетай гадавой даўніны, прысвечанай сыну Макея, які ўладкаваўся ў Аўстрыі. Праўда, бабулька думала, што гэта карэліцкая раённая газета.

> «Ішоў бы Макей у прэзідэнты, было б лягчэй», — марыць настаўніца.

На стале стаіць вялікі здымак унукаў. У кутах абразы. Некрашэвічы — праваслаўная вёска. Гаспадыня завіхаецца на кухні, збірае пад’есці нечаканым гасцям.

## З сям’і бібліятэкаркі і конюха

«У маіх бацькоў было адзінаццаць дзяцей. Я малодшая, — пачынае яна. — Хадзілі ў школу, працавалі ў калгасе, як усе. Што сказаць пра бацькоў Валодзі?.. Мой брат, яго бацька, быў конюхам. Чалавек з залатымі рукамі! Ягоная жонка Фаіна працавала ў бібліятэцы. І двое дзяцей — Валодзя і Наташа. Вось ужо год, як Фаіна сышла на той свет. А бацька трымаецца. Хоць стала здаваць здароўе. Яму цяпер 86-ы год ідзе. Дактары знайшлі гангрэну, давялося ампутаваць нагу... Валодзя, як даведаўся, сказаў: што ж вы, тата, раней не сказалі, можа, і паспелі б вылечыць вас. Але ўжо позна было... Бацька цяпер у Баранавічах, яго даглядае Наташа. Дык Валодзя часцей туды ездзіць. У Некрашэвічы заязджае нячаста, на магілкі да мамы. Заходзіць у госці і да мяне. Наташа ў Баранавічах працуе начным вартаўніком. Магла ў брата папрасіць дапамогі, але яна прывыкла сама ўсяго дасягаць».

## Гадаваўся ў беднаце

Пра Валодзю сваякі гатовыя гаварыць гадзінамі.

«Ён ужо ў пяць гадоў і чытаў, і пісаў, — кажуць з гонарам бабулькі. — Гадаваўся ў беднаце, але малайчына, вывучыўся добра, цяпер ведае ажно чатыры замежныя мовы». — «А па характары які быў? Можа, дзеўкі за ім бегалі?» — «Не-е-е! Ён спакойны быў, не выдаваўся, што добра вучыцца, акуратны быў. Валодзя быў у арміі, кажуць, што служыў нават у Афганістане, хоць і не казаў бацьку, каб той не хваляваўся».

Сястра Наташа казала цётцы, што Уладзімір быў нават паранены.

Першая жонка Макея родам з Ашмянаў. «Ці то настаўніца была, ці то рэктарка, але таксама разумная, як Валодзя», — кажа цётка.

Чаму разышліся? «Валодзя ж усё ў раз’ездах па свеце з Лукашэнкам, а яна заставалася адна... — разважае цётка. — Чамусьці ў іх не склалася. Затое сын добры ад таго шлюбу!»

Віталь Макей працуе ў дыпламатычнай місіі ў Аўстрыі, дзе пачынаў кар’еру і бацька.

Дзіця ёсць ва Уладзіміра Макея і ад другога шлюбу, з тэлевядучай Верай Паляковай. Сын Арцём нарадзіўся летась. Цікава, што палітык стаў амаль адначасова і дзядулем: у Віталя Макея ў Аўстрыі нарадзілася дачка.

## Макееўскія яблыкі

Калі памерла маці і з’ехаў у Баранавічы бацька, хата Макеяў апусцела. Сюды час ад часу наведваецца сястра Наташа, каб прыбрацца, ды заходзіць цётка. Сцежка да хаты, таксама жоўта-блакітнай, закладзеная пліткай, праз якую пайшла расці трава. За хатай сад, у якім сёлета, як ніколі раней, урадзілі яблыкі. Толькі сабраць іх няма каму. Вера Паўлаўна просіць забраць колькі зможам, інакш проста згніюць.



Пустая хата Макеяў.

> У вёсцы два прозвішчы: Макеі ды Палуяны.

«Ці выміраюць Некрашэвічы?» — пытаемся ў бабулек. «Паміраюць людзі, але дзе ж тыя вёскі, якія не выміраюць? Вельмі мала моладзі», — кажуць яны.

З Макеевых аднакласнікаў не засталося нікога, усе пераехалі ў гарады.

## Гонар школы

Уладзімір Макей павучыўся ў дзвюх школах. Базавую адукацыю атрымаў у сваёй вёсцы, а сярэднюю — у суседніх Луках. Ідзём з цёткамі паглядзець, як ушанаванае імя дзяржаўнага дзеяча ў ягонай навучальнай установе.

Перад уваходам у школу — бюст Суворава. «Раней быў калгас яго імя», — тлумачаць нам. У холе аднапавярховага будынка школы — дошка гонару. Партрэт Макея змешчаны першым з трох знакамітасцяў школы. Апроч яго — прафесар-гісторык Іван Палуян і спартовец Святаслаў Палуян. У вёсцы дамінуюць два прозвішчы: Макеі ды Палуяны.

Настаўніца расійскай мовы на чысцюткай беларускай расказвае, што школа працуе, мусіць, апошні год — сёлета нават не набіралі першакласнікаў. Усяго ў ёй васямнаццаць вучняў.

«Ніхто не ведае, ці закрыюць нас — у перадвыбарны год могуць і пашкадаваць... Ішоў бы Макей у прэзідэнты, было б лягчэй», — марыць настаўніца. Але ўсе згаджаюцца, што і Лукашэнка нядрэнны. Кіраўнік дзяржавы ўспрымаецца тут як нейкі паплечнік Макея.



Першая школа.



Перадавайце прывітанне Валодзю ў Мінск!

## Прывітанне ў Мінск

Перад развітаннем Вера Паўлаўна расказала, што турбуе яе больш за ўсё. Дайшлі чуткі пра дзеда, які наваражыў кровапраліцце на Дажынках. Цяпер некрашэвічаўцы думаюць, як папярэдзіць сваякоў з Ліды, але загадзя не спалохаць іх.

Бабулькі спадзяюцца, што Макей паспее зрабіць яшчэ шмат карыснага для сваёй вёскі. Напрыклад, па ягоным загадзе ў вёсцы паклалі асфальт. Але варта прызнацца, што клопат не набывае надзвычайных формаў. Прывезці камп’ютар у школу — гэта Макей зрабіў. Але абстаўляць класы напаўпустой школы па апошнім слове тэхнікі — навошта? А такую гіперапеку над сваімі першымі школамі дэманструе шмат хто з набліжаных да ўлады людзей. Губернатар Брэстчыны Канстанцін Сумар, кіраўнік Нацбанка Пётр Пракаповіч, бізнэсовец Юрый Чыж... Спіс можна працягваць.

...Развітваючыся, бабулькі папрасілі абавязкова перадаць прывітанне ў Мінск. Для іх Валодзі.

**Віталь Несцераў, Некрашэвічы—Мінск**




Фота з дошкі гонару.

**Уладзімір Макей. Афіцыйная біяграфія**

Нар. 5 жніўня 1958, Гродзенская вобласць. Дыпламат, кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моваў (1980), служыў у савецкай вайсковай разведцы (1980—1992), палкоўнік запасу.

Навучаўся ў Дыпламатычнай акадэміі МЗС Аўстрыі (1992—1993).

У 1993—2000 на дыпламатычнай службе — працаваў трэцім сакратаром Упраўлення інфармацыі і гуманітарнага супрацоўніцтва, другім сакратаром аддзела аналізу і прагназавання, другім сакратаром сакратарыята Міністэрства замежных справаў (1993—1995), намеснікам начальніка Службы дзяржаўнага пратакола МЗС (1995—1996), прадстаўніком Беларусі пры Радзе Еўропы, дарадцам пасольства Беларусі ў Францыі (1996—1999), начальнікам упраўлення агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва МЗС (1999—2000).

У 2000—2008 працаваў памочнікам прэзідэнта Беларусі. 15 ліпеня 2008 прызначаны кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Выступ брытанскага музыкі Стынга ў Мінску стаў найяскравейшай культурнай падзеяй верасня. Ён адбываўся ў антуражы, неўласцівым для рок-канцэрта. Стынг прадстаўляў новы альбом Symphonisity разам з Каралеўскім сімфанічным аркестрам. «Мінск-Арэну» запоўніла публіка ў вечаровых строях.**

## У тэатры Горкага хочуць паставіць оперу «Ісус Хрыстос—звышзорка» па-беларуску

Сусветнавядомая рок-опера «Ісус Хрыстос — звышзорка» Эндру Лойда Вебера можа быць пастаўленая на сцэне Расійскага тэатра на беларускай мове. Пра гэта паведаміў галоўны рэжысёр тэатра Сяргей Кавальчык.

Цяпер тэатр з дапамогай пасла Беларусі ў Брытаніі Аляксандра Міхневіча вядзе перамовы з кампаніяй The Really Useful Group, якая валодае аўтарскімі правамі на оперу. «Мы настойваем, каб мюзікл быў на нацыянальнай мове — у гэтым увесь сэнс нашай ідэі, — кажа Сяргей Кавальчык. — Уладальнікі правоў са свайго боку таксама зацікавіліся, што опера будзе перакладзеная яшчэ на адну мову свету».

Імя верагоднага перакладчыка оперы кіраўніцтва тэатра пакуль не раскрывае.

«Ісус Хрыстос — звышзорка» — мюзікл у рокавым стылі аўтарства Ціма Райса і Эндру Лойда Вебера. Упершыню ён быў пастаўлены на Брадвеі ў 1971 г. Опера напісаная паводле Святых Дабравесцяў, аднак адсылае да пякучых праблемаў сучаснасці. Шмат якія арыі з оперы зрабіліся папулярнымі песнямі: «Я не ведаю, як кахаць яго», «Гаротны Ерусалім» ды інш.

**Лявон К**

# На канцэрты Вайцюшкевіча ў Кобрыне не прадалі ніводнага квітка

У Кобрыне адмянілі два канцэрты Змітра Вайцюшкевіча. Выканаўца меўся выступіць 17 верасня для дзяцей з дзіцячага садка, а пасля абеду — для старэйшых школьнікаў. Рашэнне адмяніць канцэрты прыняла адміністрацыя ДК з-за нізкага ці, дакладней, «нулявога» папярэдняга продажу квіткоў.

Сітуацыю каментуе арганізатар канцэртаў Зміцер Назараў. «Канцэрты мусілі прайсці ў межах кампаніі «Будзьма беларусамі» і ладзіліся берасцейскай прома-суполкай «Зала чакання». Цана квіткоў складала 5 000 рублёў... Сумна, што за такія смешныя грошы не знайшліся людзі, якія жадаюць паслухаць такую музыку, сумна, што ніводныя бацькі не далі дзецям 5 000 руб. на дзіцячы канцэрт. Як зрабіць вядомым беларускіх выканаўцаў у беларускіх умовах?»

**generation.by**

**Каментар Рэдакцыі.** Адказ на гэтае пытанне ясны: рэкламай. Адэкватнай рэкламай. Ці былі ў Кобрыне каляровыя постэры з выявай Вайцюшкевіча? Ці прайшлі сябры прома-суполкі па ўсіх класах кобрынскіх школаў з расповедам пра ўнікальнасць спевака Вайцюшкевіча? Ці была замоўленая рэклама канцэрта ў «раёнцы» і на брэсцкіх FM-станцыях? Іншымі словамі: ці арганізатары зрабілі ўсё, што было ў іх сілах, і нават болей?



Бо толькі так сёння трэба дзейнічаць, прапагандуючы беларускія канцэрты, выданні.

## Магіла Фалькоўскага — прадмет даўняй спрэчкі

Улады абяцаюць усталяваць мемарыяльны знак пасля «Дажынак».

Рабочыя знеслі сімвалічную магілу ксяндза-паўстанца Адама Фалькоўскага ў гарадскім парку Ліды. Магіла была пазначаная невялікім крыжам, ля яе часта ляжалі свежыя кветкі. Ліда ж рыхтуецца прыняць фестываль «Дажынкі», таму цэнтр горада актыўна ўпарадкоўваецца.

«Сёння пасля стольκіх гадоў і перабудоваў горада цяжка вызначыць дакладнае месца магілы, — кажа рэдактар краязнаўчага часопіса «Лідскі летапіс» Станіслаў Суднік. — Калі б мы ведалі, што тая магіла — дакладнае месца пахавання, мы б, натуральна, выступілі супраць». Прадстаўнікі мясцовага аддзела ідэалогіі паабяцалі, што наўзбоч новазбудаванай алеі ў хуткім часе з'явіцца памятны камень з надпісам пра ксяндза. «Галоўнае, каб у цэнтральным парку, няважна на якім месцы, з'явіўся мемарыяльны знак Фалькоўскаму», — кажа С.Суднік.

Сімвалічная магіла Фалькоўскага — прадмет даўняй спрэчкі грамадскасці з уладай. Некалькі разоў актывісты БНФ ды іншых грамадскіх рухаў усталёўвалі крыж на месцы меркаванага пахавання ксяндза-паўстанца. Улады крыж зносілі. У 2004 годзе было дасягнутае пагадненне паміж уладай і грамадскасцю аб ушанаванні памяці ўдзельнікаў паўстання і ксяндза Фалькоўскага ў прыватнасці, аднак афіцыйны помнік так і не быў усталяваны.

**ЛК**

**Ксёндз Адам Фалькоўскі**

быў пробашчам парафіі Ішчална (Шчучынскі раён). Адзін з сямі ксяндзоў Лідчыны, пакараных смерцю за ўдзел у паўстанні 1863. Да паўстання ксёндз ачольваў патрыятычнае Брацтва Святой Тройцы. Яго найвялікшы вычын — зачытаны з амбона маніфест паўстання. Быў расстраляны царскай уладай, а яго цела было залітае вапнай, каб не захавалася парэшткаў. Калі месцы пахаванняў іншых шасці ксяндзоў невядомыя, дык месца магілы Фалькоўскага больш-менш акрэсленае — яно ў цэнтры Ліды, аднак гістарычныя дакументы падаюць вельмі прыблізныя арыенціры магілы.

## Сцісла

• **У Вільні ўсталявалі шыльду ў гонар Багушэвіча.** 17 верасня ў Вільні на вул. Арклю, 18с (Конная — бел.) адбылося адкрыццё шыльды ў гонар патрыярха беларускай літаратуры Францішка Багушэвіча. Шыльда была ўсталявана дзякуючы намаганням Таварыства беларускай мовы Віленскага краю, Пасольства Беларусі, Міністэрства культуры Беларусі, а таксама мэрый Вільні і Мінска. На адкрыцці прысутнічалі міністр культуры Павел Латушка, пасол Уладзімір Дражын. Усе беларускія чыноўнікі прамаўлялі на добрай беларускай мове.

• **Акадэмія музыкі набыла ўнікальную скрыпку.** Гэта інструмент працы Андрэа Гварнеры, выраблены ў 1673 годзе. Мець гонар сыграць на ёй будуць адораныя скрыпачы Акадэміі музыкі падчас канцэртаў.

• **Фатографа Андрэя Лянкевіча адзначылі на фестывалі Kaunas Photo Star.** Яго ўзнагародзілі персанальнай выставай у Foto Kvartals gallery ў Рызе, якая пройдзе ў 2011 годзе. Фатограф азнаёміць гасцей выставы з серыяй «Беларускае Паганства».

• **Гурт Limp Bizkit не сабраў «Мінск-Арэну».** Канцэрт пераносіцца ў Палац спорту. Час застаўся ранейшы — 5 кастрычніка, 19.00. Квіткі, набытыя ў «Мінск-Арэну», застаюцца сапраўднымі. Нагодай, хутчэй за ўсё, стала «зорная» перагружанасць канцэртнага графіка сталіцы. Акрамя нядаўняга канцэрта Стынга, мінчукі змогуць неўзабаве папрысутнічаць таксама на выступах Джо Кокера, Хасэ Карэраса і Гару і групы A-ha.

**СМ**





Арсень Ліс

# Gloria victis!

Гістарычныя партрэты дзеячаў, што стваралі беларускую дзяржаўнасць.

750 старонак ад патрыярха айчыннай навукі.

Пытайцеся ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў.




**«Харошкі» набіраюць эксперыментальны клас**

Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі» на базе дзіцячай харэаграфічнай школы № 2 г. Мінска адкрывае эксперыментальны клас для дзяцей 13–14 гадоў, якія маюць харэаграфічную падрыхтоўку. Усе выкладчыкі — у мінулым артысты ансамбля. Іх задача: перадаць выхаванцам не толькі сваё майстэрства, але і традыцыі, «фірменны» стыль «Харошак» і, вядома ж, бясконцае захапленне беларускім народным танцам. Час і месца правядзення кастынгу можна ўдакладніць па тэлефонах: (17) 331–60–52, (25) 969–69–85; пр. Незалежнасці, 50, п. 404.

# Пазаштатны біёграф Лукашэнкі

**Мікола Жыгоцкі ходзіць па выдавецтвах, спрабуючы надрукаваць кнігу пра кіраўніка дзяржавы.**




СЯМЁН ПЕЧАНКА

**Мікола Жыгоцкі**

нар. у 1931 на Шклоўшчыне. Працаваў у газеце «Савецкая Беларусь». З 1957 — супрацоўнік літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Аўтар кніг «Сцежкамі паэта: Па Коласаўскіх мясцінах», «Сэрца пакідаю вам: Па Коласаўскіх мясцінах», «Легендарны дзед». Жыве ў Мінску.

Спадар Мікола паўстагоддзя адпрацаваў у літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа ў Мінску.

«Прыйшоў туды ў 1957-м, праз год пасля смерці Коласа», — расказваў ён, завітаўшы ў рэдакцыю «НН». Жыгоцкі — аўтар кніг пра Якуба Коласа, коласаўскія мясціны, коласаўскіх герояў, у прыватнасці, дзеда Талаша. А яшчэ спадар Мікола напісаў тры кніжкі пра дзейнага кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнку. Ніводную з тых трох кніг не напаткаў шчаслівы лёс.

У першай, «Александр Лукашенко», аўтарства Жыгоцкага замянілі на калектыў пісьменнікаў і выдалі па-расійску. Наклад другой, «Александр Лукашенко — первый президент Республики Беларусь», так і не выйшаў, у 2008 годзе пабачылі свет толькі сігнальныя асобнікі. А трэцяя, «Жыццё для людзей», не першы год застаецца ў рукапісе.

Што прымусіла коласазнаўца пераключыцца на асобу Лукашэнкі?

«Калі Аляксандр Рыгоравіч быў дэпутатам Вярхоўнага Савета, я пачуў, што ён мой зямляк. Я ж таксама са Шклоўшчыны, толькі мае родныя мясціны — бліжэй пад Бялынічы. Я вырашыў пазнаёміцца з ім. Пайшоў у Дом урада. Але там Лукашэнку не сустрэў. Тады пачаў шукаць любыя матэрыялы аб ім».

### Скобелеў перапісаў

Калі ўжо зямляк стаў першай асобай у дзяржаве, спадар Мікола вырашыў прысвяціць яму буклет. І пачаў дэталёва даследаваць біяграфію. «Але дырэктар выдавецтва «Навука і тэхніка», да якога звярнуўся з ідэяй, месяцы тры мяне з кабінета выганяў, не хацеў слухаць. Пасля я яго ўсё-такі заахвоціў. Патрэбныя былі здымкі. Звярнуліся да фатографа Пятра Кастрамы, які працаваў у Адміністрацыі прэзідэнта. А ён расказаў аб нашым праекце на працы. Праз нейкі час мне патэлефанаваў Эдуард Скобелеў, супрацоўнік Адміністрацыі, і сказаў, каб з усімі матэрыяламі я прыйшоў да яго».

Гэты крок Мікола Жыгоцкі лічыць памылковым. Па яго словах, дзіцячы пісьменнік і чыноўнік Скобелеў упісаў сябе складальнікам кнігі. Паводле словаў спадара Міколы, ён сваю кнігу пісаў па-беларуску. Расійскамоўнай яна стала, трапіўшы да Скобелева. З рэдактарскіх рук кніга выйшла ідэалагічна вывераным, раскладзеным па палічках наборам праграмных тэзісаў Лукашэнкі.

### «Так мяне абшчыпалі з першым выданнем»

Па словах Жыгоцкага, ён нічога не атрымаў за сваю працу. Адно што кнігу паказалі яе галоўнаму герою. І той паставіў аўтограф: «Жигоцкому с уважением». Кніга ж пісалася не толькі з чыста даследчыцкага інтарэсу. «Я разлічваў, ён як-небудзь музею паспрыяе, як пабачыць кнігу», — кажа аўтар.

У выходных звестках кнігі пазначаны гіганцкі наклад: сто тысяч асобнікаў. Спадар Мікола не каментуе, толькі шматзначна махае рукой.

Кампліментарнае выданне пабачыла свет у 1997 годзе, пасля рэферэндумаў аб двухмоўі, змене сімволікі і Канстытуцыі. Як пачуваўся аўтар і зямляк, заўважаючы, што ўлада ўзяла курс на знішчэнне Беларушчыны?

«Аднойчы я пачуў, як Лукашэнка грэбліва выказаўся пра беларускую мову. Гэта адна з прычын, па якой я хацеў з ім убачыцца. Хацеў спытаць: «Чаму такі заняпалы стан роднай мовы?» — кажа спадар Мікола і дзівіцца з такой пазіцыі Лукашэнкі. Бо яго жонка, Галіна Радзівонаўна, напрыклад, выказвалася за беларускую мову заўжды. Яе аўтограф стаіць на фарзацы другой кнігі Міколы Жыгоцкага: «Александр Лукашенко — первый президент Республики Беларусь».

«Так мяне абшчыпалі з першым выданнем. І я вырашыў працаваць над сваёй уласнай кнігай далей», — распавядае Жыгоцкі.

### Праз пасярэдніцтва Віктара

Новая кніга з'явілася праз адзінаццаць гадоў, у 2008-м, з пазнакай «выданне для моладзі». У свет, праўда, выйшлі толькі некалькі сігнальных асобнікаў.

«Мяне з дырэктарам выдавецтва выклікалі ў Міністэрства інфармацыі, дзе сказалі, што заўчасна выдаваць такую кнігу». І сігнальныя асобнікі засталіся толькі адзінымі надрукаванымі».

### «Шэймана дарма далі...»

Хоць дазвол на выданне другой кнігі аўтар атрымаў ад Лукашэнкі праз пасярэдніцтва яго старэйшага сына Віктара. Сын і ліст адпаведны прыслаў у выдавецтва. Але калі спадар Жыгоцкі звярнуўся да малодшага сына Лукашэнкі Дзмітрыя, каб той матэрыяльна паспрыяў выданню кнігі, атрымаў адмову. Дзмітрый напісаў, што займаецца толькі справамі сваёй кампетэнцыі. І з кнігавыданнем нічога не мае супольнага.

Гартаем той сігнальны асобнік. Ён ілюстраваны не толькі фота, але і маляванымі графічнымі партрэтамі: Віктар, Дзмітрый, Галіна Радзівонаўна, пры канцы нават Канаплёў і Шэйман. «Шэймана дарма далі...» — каротка заўважае аўтар.

Другая кніга таксама не без купюр. Спадар Мікола кажа, што «пісаў шырэй», што было ў кнізе і пра няўдачы, і пра зніклых людзей. Хто гэта зрэзаў — не расказвае.

### «Як пойдуць на пенсію, тады і будуць жыць разам»

Працуючы са сваімі кнігамі, Мікола Жыгоцкі сустракаўся з маці Лукашэнкі і яго жонкай. Але пра тыя сустрэчы распавядае стрымана: «У сямейныя адносіны пры размовах з жонкай я не ўлазіў. Гэта лагодная, прыветная жанчына. Як яна ўспрыняла тое, што муж — у Мінску, а яна засталася ў вёсцы? Казала, што яны так дамовіліся. Маўляў, як пойдуць на пенсію, тады і абагуляцца, будуць жыць разам».

Што быў Лукашэнка за чалавек у паўсядзённым жыцці? «Чытаў многа, як расказвалі настаўнікі. Справядлівым быў, як успаміналі землякі. За тое ж яго і выбралі ў дэпутаты». Лукашэнка не п'е, прапагандуе спорт. А ў маладосці ён быў такім самым? Мікола Жыгоцкі распавядае, што ў студэнцкія гады будучы прэзідэнт мог і выпіць. А перастаў ужываць спіртное пасля выпадку на ўборцы бульбы. «Ехаў ён на возе, а воз перакуліўся. І Лукашэнка надта пабіўся. Пасля гэтага перастаў піць».

Ці ведае біёграф, калі нарадзіўся Лукашэнка — 30 ці 31 жніўня? Спадар Жыгоцкі кажа, што нарадзіцца мог і акурат 31-га. Але пэўнасці няма. А вось факт збіцця механізатара падчас працы дырэктарам саўгаса, які не афішуецца, пацвярджае: «Было гэта. Справа была заведзеная на Аляксандра Рыгоравіча. Я яе глядзеў у Шклове. Пілі ж механізатары. А яму трэба было хлеб убіраць. Мо ён і штурхануў таго, разлялаваўшыся».

### Жыццё для народа нікому не трэба

У рэдакцыю «НН» спадар Мікола прынёс аб'ёмістую тэчку з карэктурай сваёй трэцяй кнігі пра славутага земляка — «Жыццё для народа». Праблема ў тым, што яе ніхто не бярэцца выдаваць. «У пачатку года мяне прыняў Усевалад Янчэўскі, начальнік Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі прэзідэнта. Ён станоўча ўспрыняў маю працу. Сказаў, каб я шукаў выдавецтва. Маўляў, дапаможа. Але я пайшоў адтуль, і ён нічога не зрабіў».

Звяртаўся аўтар і ў Расію. Наўпрост тэлефанаваў у смаленскую друкарню. Там сказалі, што за грошы Жыгоцкага гатовыя надрукаваць кнігу. А вось распаўсюджваць не возьмуцца.

Першая кніга, «Александр Лукашенко», выйшла ў 1997 годзе. З таго часу герой памяняўся. Ці ёсць у аўтара за што яго крытыкаваць? «Так, шмат абзацаў, а па сутнасці не выканаў нічога».

Пакрыўджаны спадар Мікола і на тое, што Лукашэнка ні разу яго не прыняў. «Расійскага гісторыка Роя Мядзведзева прымаў нават. А для мяне яго Адміністрацыя сустрэчы так і не наладзіла». І ківае ў бок усяго чыноўніцтва: «Яны нікога не прымаюць. Толькі гавораць. Я сядзеў у прыёмнай начальніка галоўнага ўпраўлення па працы са зваротамі грамадзян і юрасобаў Адміністрацыі прэзідэнта Буко. Дык там столькі людзей збіраецца! І ўсе гавораць адкрыта. Адзін казаў: я зараз пайду пысу яму наб'ю. А міліцыянт толькі просіць, каб ціпэй гаварылі. Буко абяцаў мне патэлефанаваць. Але званка і да сёння няма».

Пры канцы гутаркі выказваю сумнеў, што матэрыял у «НН» паспрыяе выданню «прэзідэнцкіх» кніг спадара Міколы. «А, няхай, — адказвае аўтар. — Але трэба, каб гэта засталося для гісторыі. Што быў такі бядак — Мікола Жыгоцкі».

**Сяргей Макарэвіч**



# Беларуска стала тварам брэнда Mango

**Беларуская мадэль Анабэла Белікава ў адным шэрагу з акторкай і спявачкай Скарлет Ёхансан стала тварам новай калекцыі MANGO восень—зіма 2010—2011.**

Белікава — адна з самых паспяховых беларускіх мадэляў у сусветнай індустрыі моды. У 15-гадовым узросце яна прайшла кастынг у мадэльным агенцтве Сяргея Нагорнага. Праз некалькі тыдняў школьніцу з Брэста запрасілі працаваць у Японію. Настасся (гэта яе сапраўднае імя) тады толькі скончыла восьмы клас.

Наступным пунктам у кар'ерным росце стаў Парыж. Насцяў у Парыжы, як ні дзіўна, хапала, таму дзяўчына стала Анабэлай. Першай прыкметнай працай пад новым імем было супрацоўніцтва з Prada. Падчас кастынгу для паказу вясна—лета-2007 мадэль настолькі спадабалася Міучэ Прада, што неўзабаве дэбютавала на міланскім подыуме і стала тварам вяснова-летняй калекцыі гэтага моднага дома.

Імклівы кар'ерны рост Анабэлы здзіўляў: усяго за паўтара года яна стала вядомай у свеце моды. Канешне, была рызыка такога ж хуткага «падзення», калі раптам з'явіцца мода на дзяўчат з іншай знешнасцю. Аднак Анабэла здолела перайсці з катэгорыі «подыумных мэдэляў» у «топ-мадэлі»: яе пачалі запрашаць у рэкламу і на акцыі модных брэндаў. Ужо другі год Анабэла з'яўляецца тварам брэнда Vera Wang, дызайнер якога шые найлепшыя ў свеце вясельныя сукенкі. Цяпер Анабэла, акрамя вобразу сціплай, свежай і па-дзіцячы непасрэднай нявесты ў адзенні Vera Wang, дапоўніла калекцыю вобразаў дзёрскай, непакорнай, але стылёвай дзяўчыны ў адзеннні ад Mango.

Калекцыя 2010—2011 пазіцыянуецца як выключна практычнае адзенне. Дызайнеры Mango запазычылі з міжнароднага подыума шорты і спадніцы са скуры , якія ў калекцыі Mango выдатна спалучаюцца з утульнымі вязанымі кардыганамі (бавоўняны жакет, без каўняра, на гузіках, з глыбокім выразам) і блузамі з шыфону. Адзін з самых папулярных матэрыялаў восеньскага сезона — аксаміт. Таксама актуальныя сукенкі-максі і спадніцы. Модная сёлета колеравая гама — адценні шакаладнага, карычневага і бэзавага.

**Настасся Шамрэй**

ЛЮБОШЧЫ

# За што дзяўчаты любяць дрэнных хлопцаў

**Дзяўчаты мараць аб добрых, а выбіраюць усё адно дрэнных.**

Што ж стаіць за гэтым? Давайце паспрабуем разабрацца. На самой справе ўсё проста.

Добрыя хлопцы любяць добра апранацца. Аднак яны нешта хаваюць. У іх няма ўпэўненасці ў сабе, і яны спрабуюць кампенсаваць гэта вопраткай. Іх крыху шкада і ні крышачку з імі не цікава. Упэўненыя ў сабе мужчыны адчуваюць сябе аднолькава добра ў любой вопратцы: ці то спартыўны касцюм, джынсы ці што-небудзь яшчэ. Ім няма неабходнасці нешта даказваць навакольным. Яны ўжо даказалі сабе ўсё.

Добрыя хлопцы баяцца прымаць рашэнні. Яны спрабуюць перакласці адказнасць. Ёсць у іх такая шкодная звычка — перакладаць адказнасць. Дрэнныя хлопцы могуць памыляцца, могуць нават пакрыўдзіць жанчыну, але яны не будуць хавацца.

Добрыя хлопцы любяць знаходзіцца з дзяўчынай, калі ёй добра. Яны маюць уласцівасць абстрагавацца, як толькі ўзнікаюць непрыемнасці, нават дробныя. Яны нават не паспрабуюць дапамагчы. Яны без усялякіх тлумачэнняў сыдуць у сябе. Проста добрыя хлопцы не любяць абцяжарваць сябе чужымі праблемамі, нават калі гэта праблемы іх дзяўчыны. Бо добрыя хлопцы не ўмеюць біцца. І яны адыходзяць убок, калі дрэнна блізкаму чалавеку. І зноў з'яўляюцца, калі ўсё наладзілася. Няма ніякіх гарантый, што дрэнны хлопец дапаможа. Але паспрабуе, гэта ўжо дакладна! І няма тут нічога асаблівага! Проста ён любіць адчуваць сябе героем.

Добрыя хлопцы лёгка трапляюць пад уплыў бабулі, цёткі, мамы, таты, найлепшага сябра і гэтак далей. Што азначае гэта для дзяўчыны? Проста калі яна не спадабаецца каму-небудзь з яго сваякоў, то шанцы роўныя нулю. Калі дзяўчына не спадабаецца каму-небудзь са сваякоў дрэннага хлопца, ён будзе любіць яе яшчэ мацней. Ён любіць працэс пераадолення цяжкасцяў.

Добрыя хлопцы плывуць па плыні. Яны любяць ва ўсім парадак. Усё робяць па правілах. У галаве ў добрых хлопцаў усё раскладзена па паліцах. Яны ведаюць, як павінна быць у людзей і імкнуцца да гэтага. Дрэнныя хлопцы проста жывуць. Яны памыляліся самі, і таму возьмуць дзяўчыну такой, якая яна ёсць.

Добры хлопец будзе стаяць пад дзвярыма і так нясмела стукаць у дзверы, што дзяўчына не пачуе яго. Дрэнны хлопец ўвойдзе да дзяўчыны ў любым выпадку. Хутчэй за ўсё, калі яна яму не адкрые, праз акно. Так нават цікавей. Дзяўчына будзе піць валідол. Магчыма, у яе нават будзе істэрыка. Але выгнаць яго таксама не зможа.



Добрыя хлопцы любяць выхоўваць і хочуць, каб дзяўчына змянілася. Яны прачыталі мноства кніг і лічаць сваім абавязкам паведаміць пра гэта. Яны мучаюць сваім занудствам. І хочацца закрыць вушы, каб іх не чуць, закрыць вочы, каб іх не бачыць, і бегчы, бегчы ад іх як мага далей.

Любімы занятак добрых хлопцаў — разважанні пра будучыню. Дрэнныя хлопцы робяць будучыню зараз. Яны дзейнічаюць, памыляюцца, зноў дзейнічаюць. Гэта больш падобна на жыццё. Добрыя хлопцы пагарджаюць дрэннымі хлопцамі, таемна, вядома. Яны нічым не выдаюць свайго стаўлення да дрэнных хлопцаў, бо памятаюць, што тыя, у адрозненне ад іх, умеюць біцца. Дрэнныя хлопцы ставяцца да добрых абыякава. Проста яны ведаюць, з кім уцякаюць дзяўчаты...

**femina.com**

КАЛЬКУЛЯТАР

# Новы рэкорд у вылічэнні «пі»

Даследчыкі вылічылі двухквадрыльённую лічбу ліку «пі». Як паведамляюць інфармагенцтвы, гэта ў два з лішнім разы перакрывае ўстаноўлены раней рэкорд вылічэння ліку «пі». Лік «пі» роўны адносінам даўжыні акружнасці да яе дыяметра. Гэта бясконцы дзесятковы дроб. Пагоня за лічбамі пасля коскі ў ліку «пі» — адно з самых любімых практыкаванняў матэматыкаў. Нікалас Чжэ вызначыў 2 000 000 000 000 000-ю лічбу.

Калі б такая работа вялася на адным камп'ютары, спатрэбілася б 500 з лішнім гадоў, але матэматык выкарыстоўваў тэхналогію так званых воблачных (або рассеяных) вылічэнняў, на якую завязана тысяча камп'ютараў. Нават пры гэтым калькуляцыя ў вучонага заняла 23 дні. Вылічэнні вяліся з прымяненнем метаду MapReduce, сутнасць якога ў тым, што вялікая задача разбіваецца на мноства малых, і такім чынам рашаюцца матэматычныя ўраўненні, да якіх інакш проста не падступіцца.

**БЕЛТА**



**Што ні край, то звычай. Удзельнікі ўрачыстай працэсіі падчас святкавання 200-годдзя незалежнасці Мексікі. Упрыгажэнне шкілетаў на святы — даўняя, яшчэ ад ацтэкаў, традыцыя. Уявім сабе такіх на праспекце Пераможцаў у Мінску 3 ліпеня...**

ДАРОГА

# Чаму столькі беларусаў гіне ў аварыях?

Чыноўнікі Мінтранса прызнаюць, што аварыйнасць у Беларусі характарызуецца высокай цяжкасцю наступстваў. У Еўропе смяротнасць ніжэйшая.

Выпрымка з дакумента: «Адносны паказчык сацыяльнай рызыкі, які вызначае рэйтынг краін па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху, у Рэспубліцы Беларусь (колькасць загінулых у выніку ДТЗ на 100 тыс. жыхароў) складае 13,9, што значна перавышае ўзровень, дасягнуты ў краінах Заходняй Еўропы (Швейцарыя — 4,9, Швецыя — 5,2, Германія — 6,0 і Фінляндыя — 7,2).

На пачатак 2010 у рэспубліцы агульная колькасць транспартных сродкаў (аўтамабіляў і матацыклаў) склала больш за 3,2 млн адзінак (прыкладна 340 адзінак транспартных сродкаў на 1000 жыхароў рэспублікі), у тым ліку ў індывідуальных уладальнікаў — больш за 2,8 млн адзінак. За апошнія 10 гадоў штогадовы прырост агульнай колькасці транспартных сродкаў склаў каля 80 тыс. адзінак, прычым практычна за кошт транспартных сродкаў індывідуальных уладальнікаў.

Каэфіцыент цяжкасці наступстваў ад ДТЗ у рэспубліцы (колькасць загінулых са 100 пацярпелых у ДТЗ) за апошнія 10 гадоў знаходзіцца ў межах 15,5—20, што ў 3—8 разоў перавышае ўзровень, дасягнуты ў краінах з развітай аўтамабілізацыяй. Пры гэтым у Мінскай, Гомельскай і Віцебскай абласцях значэнні гэтага паказчыка складаюць 21,7, 19,0 і 18,6 адпаведна».

**resurs.by**

ПРЭПАРАТЫ

# Кава як сродак уплыву на людзей

Аўстралійскія навукоўцы адкрылі раней невядомую ўласцівасць кавы — як быццам з дапамогай гэтага напою можна змяніць меркаванне чалавека. Паводле даследаванняў навукоўцаў з Квінсленда, кафеін дапаможа вам перавесці апанентаў у спрэчцы на свой бок. 140 добраахвотнікаў паўдзельнічалі ў эксперыменце, цягам якога ім трэба было адказваць на пытанні наконт абортаў. Адбывалася ўсё ў форме дэбатаў і, як заўважылі навукоўцы, пасля пары кубкаў кавы іх меркаванне змянялася на процілеглае. Прычым змяніла меркаванне большасць.

**ЮУ**



# Сорак твораў на саракавіны

Пра выставу Міхала Рагалевіча піша **Сяргей Харэўскі**.

У арт-кавярні «Добрыя мыслі» (Магілёўская, 12) у Мінску ідзе выстава жывапісу і малюнкаў Міхала Рагалевіча. Сябры і калегі самі вырашылі аддаць даніну памяці мастаку. Экспазіцыя ўпамяць Міхала Рагалевіча адкрылася на саракавіны па ім.

Геніяльны творца сышоў з нашага свету ў жнівеньскі сквар. Нават многія калегі дазналіся пра ягоную смерць праз доўгі час. Зрэшты, і жыць Міхал Рагалевіч імкнуўся так, каб не стварыць каму клопату. Так сталася, што ніхто не парупіўся стварыць камісію па ягонай творчай спадчыне, зафіксаваць, кадыфікаваць ягоны даробак, вызначыць вартасць палотнаў, каб зберагчы іх для нацыі. Ягонага бацьку расстралялі ў 1933 г., маці арыштоўвалі двойчы, а ўрэшце выправілі ў Сібір, скуль яна не вярнулася.

Пазней мастак прысвяціў сваёй маці некалькі палотнаў... Міхась Рагалевіч з маленства стаў самотным, скрозь усё жыццё носячы таўро сына «ворагаў народа».

Але мастак, насуперак спакутаванаму дзяцінству, сіроцтву і адзіноце, збярог і веру ў чысціню чалавечых пачуццяў, і сваё высокае пакліканне. Ён напаўняў свой свет летуценнямі, марамі пра непараўнальна высокае, чыстае і свежае. У ягоных палотнах багата жывых кветак, перадусім — ружаў і квітнеючых садоў.

Яго карціны ўтрымліваюць больш, чым адкрываецца выпадковаму погляду. У жанры партрэта Рагалевіч развіў уласны маляўнічы канон, непараўнальную творчую манеру. Ягоныя мадэлі надзеленыя яркай індывідуальнасцю, прычым робіцца гэта надзвычай скупымі, але дакладнымі мастацкімі сродкамі: лёгкім нахілам галавы мадэлі, зменаю становішча рук або абрысамі рота — жарснага, іранічнага або панурага.

А звонкія, зіхоткія, як вітраж, адкрытыя фарбы, пакладзеныя са стрыманасцю, зусім не ўласцівай большасці іншых мастакоў. Творчая манера Міхася Рагалевіча змянялася ад дэкаратыўнаканструктыўных, блізкіх да кубізму твораў, гэтакіх як «Чырвоны дом у Лошыцы» (1968) або «Кактусы» (1972), да лагодных, пяшчотных, пекных палотнаў кшталту «З рук у рукі» (1991) і «Бабіна лета» (1998).

Мастацтва Рагалевіча адметнае і тым, што ён адным з першых мастакоў пачаў раскрываць праўду аб камуністычных рэпрэсіях. Колькі невялікіх, камерных аўтабіяграфічных палотнаў апавядала гледачам пра трагедыю сям'і Рагалевіча і ўсёй Беларусі. Мастак пачаў паказваць іх на выставах яшчэ ў 1960-я, калі большасць прысвячала свае творы радасным будням у сацыялістычным раі. Таму Рагалевіча савецкія мастакі і чыноўнікі імкнуліся забыць яшчэ пры жыцці.

У творах 1980—1990-х у мастацтве Рагалевіча з'явіліся драматычныя пошукі ўласнага прызначэння, адказаў на тыя пытанні, што задавала яму само жыццё... Але перадусім ён пісаў шмат кветак, часта — малых дзяцей, будаваў у сваіх палотнах той дом, якога не меў на зямлі, такі лёс, якому не наканавана было здзейсніцца пры жыцці.

Рагалевіч прынцыпова не прадаваў сваіх карцінаў, адорваючы рэдкіх людзей сваімі творамі. Ён лічыў, што ўсе ягоныя палотны разам — цэласны і неразрыўны дар, як дар самога жыцця. Некалькі ягоных палотнаў прыдбаў Нацыянальны мастацкі музей.

У кавярні «Добрыя мыслі» выстаўленыя апошнія карціны і малюнкі, што засталіся ва ўласнасці сям'і. У тых, хто любіць мастацтва і шануе творцаў, ёсць гэтымі днямі ўнікальная магчымасць пазнаёміцца з творчасцю геніяльнага беларускага мастака. Гэта адзіная і апошняя магчымасць іх убачыць...

**Чытайце таксама:**
gw.lingvo.minsk.by/nn/1998/19/10.htm



МІХАЛ РАГАЛЕВІЧ. ДЗЯЦІНСТВА

**Міхал Вікенцьевіч Рагалевіч**

нарадзіўся 29 верасня 1932 у пасёлку Глінішчы, на Уздзеншыне, памёр 8 жніўня 2010. У пачатку 1930–х бацькі Міхала былі рэпрэсаваныя, таму выхоўваўся ён у дзіцячым доме. У 1964 скончыў Мінскае мастацкае вучылішча. Удзельнік мастацкіх выставаў з 1966. Сябар Саюза мастакоў з 1978. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, у Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску.

## ІМПРЭЗЫ

### Талькаўскі фэст

**3 кастрычніка** — Талькаўскі фэст. **Збор а 12-й каля клуба.** Падрабязнасці — www.talka.info. Т.: (8–01713)–71410, e–mail:talka5@tut.by.

### Crivia Aeterna

**25 верасня а 18-й у R-club (вул. Сурганава, 26)** распачнецца неафолк–фестываль Crivia Aeterna. У рамках фэсту выступіць найлепшы этна–гурт Літвы **Donis**. Яшчэ адным і гасцямі фестывалю стане расійскі неафолк–гурт **Majdanek Waltz**. Беларускую частку фэсту складуць **Pragnavit** (Магілёў), **Svalbard** (Гомель), **Тодар Кашкурэвіч і ягоны гурт Essa**, а таксама мінезінгеры з **Testamentum terrae**. Апрача таго, на фэсце выступяць маладыя музыкі з гурта **Sevast**.




## КАНЦЭРТЫ

### «Крама» ў «Графіці»

**8 кастрычніка а 19-й у «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт «Крамы».

### Cezarykonradtrio

**26 верасня ў Белдзяржфілармоніі (пр.Незалежнасці, 50) а 19-й** — канцэрт джазавай музыкі ад Cezarykonradtrio. Музыка трыа — гэта перадусім элементы джаза і прагрэсіўнага рока, які спецыялісты акрэсліваюць як fusion. Для менш дасведчанай публікі — магчымасць здзейсніць падарожжа ў невядомае з найлепшымі праваднікамі. Для знаўцаў — шанец пачуць майстэрскае выкананне.

## ВЫСТАВЫ

### Зямля пад белымі крыламі

**У Мастацкім музеі** працуе маштабная выстава беларускага мастацтва «Зямля пад белымі крыламі», на якой можна ўбачыць працы звыш 300 аўтараў — народных мастакоў Беларусі, лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі.

### Габелены

**22 верасня ў 17.30 у Палацы мастацтва (вул.Казлова, 3)** — адкрыццё выставы «Габелены галерэі Zacisze». Выстава працуе **да 8 кастрычніка**.

### Фатограф свайго часу

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 31 кастрычніка** працуе выстава «Фатограф свайго часу», прысвечаная 120–годдзю з дня нараджэння беларускага фотамайстра Ісака Салавейчыка. На выставе будуць прадстаўленыя арыгіналы і копіі фатаграфічных работ Ісака Салавейчыка — патрэты дзеячаў беларускай навукі і культуры, — створаныя ў перыяд 1952–1960 гг. падчас ягонай працы ў газеце «Літаратура і мастацтва» і Дзяржаўным мастацкім музеі БССР.

### Тэхна-арт. Знак якасці

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» да 25 кастрычніка** працуе выстава «Тэхна–арт. Знак якасці», на якой прадстаўлена тэхна–мастацтва выдатнай якасці: камп'ютарная анімацыя, лічбавае фота і мантаж…

### Аксамітны трусік

Гістарычны музей прапануе ўсім ахвотным узяць удзел у выставе «Аксамітны трусік», якая адбудзецца **з 26 кастрычніка да 12 лістапада ў Доме-музеі I з'езда РСДРП**. Калі Вы самі робіце цацкі для дзяцей, падзяліцеся сваімі творамі з музеем на час правядзення выставы. Ад Вас чакаюць цацак з самых розных матэрыялаў: гліны і салёнага цеста, дрэва і тканіны… Усе цацкі будуць вернутыя гаспадарам па заканчэнні выставы. Заяўкі на ўдзел у выставе можна даслаць да 18 кастрычніка на адрас kassiana@tut.by. У заяўцы трэба пазначыць назву выставы, прозвішча і імя, пашпартныя дадзеныя, нумар кантактнага тэлефона.

### Дамы-музеі: выкшталцоны стыль італьянскага жыцця

**У Гістарычным музеі** працуе выстава «Дамы–музеі: выкшталцоны стыль італьянскага жыцця», на каторай можна будзе ўбачыць выявы дзесяці італьянскіх дамоў–музеяў — ад вілы Джузэпэ Вердзі ў Эміліі да Вітарыяне Габрыяэле Д'Анунцыё на возеры Гарда, ад апартаментаў сям'і Савоя ў Турыне да Палаца Мірта ў Палерма.

### Карані

**У мастацкай галерэі «Палац мастацтва»** працуе персанальная выстава Аляксандра Кошалева «Карані», прымеркаваная да 50–годдзя мастака. Закінутыя сядзібы, палескія прасторы, красаванне садоў, гудзенне пчол — усё гэта тэмы ягоных прац. Серыя прац прысвечана мясцінам, звязаным з жыццём М.Агінскага, Я.Чачота...

### Жывапіс Валянціна Губарава

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 3 кастрычніка** працуе выстава жывапісу Валянціна Губарава «Проста так».

### Выстава не пра Японію

**У выставачнай галерэі Відэацэнтра ГЦ «Сталіца» (пл.Незалежнасці, ніжні ўзровень)** працуе персанальная фотавыстава Ежы Федаровіча (Беласток, Польшча) «У краіне ўзыходзячага сонца». Сваімі працамі ён паказвае, што, каб заўважыць прыгажосць, не трэба недзе далёка ехаць.

### Гіганты Ледавіковага перыяду

**У Гістарычным музеі да 26 верасня** працуе выстава «Гіганты Ледавіковага перыяду». Мадэлі жывёл для выставы аднаўленыя па шкілетах даўніх вымерлых істот. Для гэтага выкарыстоўваліся сучасныя камп'ютарныя праграмы з трохмернай графікай. Экспанаты рухаюцца і рыкаюць!

## ТЭАТРЫ

**22 верасня**

**Оперы і балета** — «Дзікае паляванне караля Стаха»
**Лялек** — «Драй швэстэрн»
**Купалаўскі** — «Офіс»
**Купалаўскі** — «Тэатраманія»

**23 верасня**

**Імя Горкага** — «Свабодны шлюб»
**Купалаўскі** — «Вечар»
**Оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»
**Купалаўскі** — «Офіс»

**24 верасня**

**Купалаўскі** — «Маэстра»
**Оперы і балета** — «Іаланта»
**Юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»
**Імя Горкага** — «Расейскія вадэвілі»

**25 верасня**

**Зніч** — «Адзінокі птах»
**Юнага гледача** — «Тры парсючкі»
**Імя Горкага** — «Расейскія вадэвілі»
**Оперы і балета** — «Кармен»
**Купалаўскі** — «Макбет»

**26 верасня**

**Лялек** — «Піпі–Доўгаяпанчоха»
**Юнага гледача** — «Тры парсючкі»
**Купалаўскі** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Оперы і балета** — «Спартак»
**Імя Горкага** — «Свабодны шлюб»

**27 верасня**

**Купалаўскі** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Зніч** — «Адзінокі птах»

**28 верасня**

**Імя Горкага** — «Распуснік»
**Юнага гледача** — «Ліса і вінаград»
**Оперы і балета** — «Травіята»
**Беларускай драматургіі** — «Вясёлы калейдаскоп»

**29 верасня**

**Юнага гледача** — «Шытая лялька Рэгедзі Эн»
**Оперы і балета** — «Папялушка»
**Купалаўскі** — «Паўлінка»
**Імя Горкага** — «Эсфір»
**Беларускай драматургіі** — «Вясёлы калейдаскоп»

**30 верасня**

**Купалаўскі** — «Памінальная малітва»
**Оперы і балета** — «Папялушка»
**Імя Горкага** — «Перад заходам сонца»

## КІНО

### Мачэтэ

**Machete**
ЗША, 2010, каляровы, 105 хв.
**Рэжысёр:** Роберт Радрыгес
**Ролі выконваюць:** Дэні Трэха, Робэрт Дэ Ніра, Джэсіка Альба, Стывен Сігал
**Жанр:** Крымінальны баявік
**Адзнака:** 7,5 (з 10)




Падчас замаху на сенатара найміт Мачэтэ заўважае, што сам на прыцэле. Цудам пазбегнуўшы смерці, герой пачынае паляваць за нягоднікамі, якія яго падставілі. Сярод ворагаў — і зльдні, якія некалі забілі жонку Мачэтэ. Помста героя будзе хуткай і вострай.

«Мяса» ў фільме хапае. Мачэтэ (Дэні Трэха) сцінае рукі, ногі і галовы дрэнных хлопцаў. Прыгажуні з кулямётамі і медсясцёркі з гранатамі — на баявых падтанцоўках.

Карціна паказаная на Венецыянскім фэсце па–за конкурсам. Ідэальная стужка для саракагадовых падлеткаў і кінаманаў.

**Андрэй Расінскі**

# GPS-навігатары — размаўляй са мной па-беларуску

Асноўныя гульцы на рынку навігатараў для Беларусі.

Развіццё тэхналогій і з'яўленне ў масавым выкарыстанні навігатараў яшчэ не выцесніла з ужытку звычайныя карты і атласы, але стварыла ім сур'ёзную канкурэнцыю. Лежачы дома на канапе, можна пагартаць і старонкі атласа. А вось ехаць, расклаўшы карту на рулі, не толькі нязручна, але і небяспечна.

Што такое GPS-навігатар? Калі ў трох словах, то гэта разумная электронная карта. Якая і пралічыць аптымальны маршрут, і папярэдзіць пра небяспечны ўчастак на дарозе, і падкажа, дзе знайсці найбліжэйшую запраўку ці, напрыклад, аптэку.

Таксама навігатар дазваляе, напрыклад, паглядзець кіно ў доўгай дарозе. Але гэта — для пасажыраў, кіроўцу глядзець фільм будзе нязручна.

Усё часцей навігатары ў машыне ўключаюць і кіроўцы таксі. Апарат адразу паказвае адлегласць і найкарацейшы маршрут, што выклікае давер у пасажыра.

### Прынцып працы

GPS-навігатар складаецца з прымача і камп'ютара ў адным корпусе. Кожны з іх мае сваю функцыю. Прымач атрымлівае сігналы, якія перадаюцца спадарожнікамі з арбіты, а камп'ютар расшыфроўвае сігнал і вызначае месцазнаходжанне навігатара. Колькасць спадарожнікаў складае некалькі дзясяткаў. Распрацоўка амерыканскіх вайскоўцаў запрацавала яшчэ ў 1977 годзе, але была па першым часе таямніцай. Галоўнае, што за выкарыстанне сігнала спадарожніка нічога плаціць не трэба.

### Афіцыйныя карты Беларусі

У навігатары галоўнае — падрабязныя карты. Першай ліцэнзійнай картай у Беларусі стаў «Аўтаспадарожнік». Хоць праграма і расійская, схема створаная і падтрымліваецца айчынным РУП «Белгеадэзія», што падкрэслівае сур'ёзнасць праекта. На мапе Мінска намаляваныя ўсе дваравыя праезды. У абласных цэнтрах і найбольшых гарадах Міншчыны карта прапісана аж да нумароў дамоў, а яшчэ ў 100 населеных пунктах — толькі назвы вуліц. Праграма ведае кожную вёску Беларусі. Распрацоўшчыкі хваляцца, што ў іх праграме ўказаныя нават пасты ДПС, не кажучы пра славутыя мясціны краіны.




Кошт ліцэнзіі складае 90—115 тысяч рублёў. У сэрвіс уваходзіць магчымасць абнаўлення карты цягам года. У Расіі праграма ўжо падтрымлівае анлайн-сэрвіс «Яндэкс-Заторы» («Яндекс-Пробки») у Маскве. На машыны ўсталёўваюцца дадатковыя датчыкі, якія сочаць за хуткасцю і інфармуюць пра ўскладнены рух на асобных дарогах. У выніку астатнія кіроўцы загадзя ведаюць, якія ўчасткі варта аб'ехаць. Мяркуецца, што неўзабаве «Яндэкс-Заторамі» зоймуцца і ў Мінску. Паколькі інфармацыя пра заторы перадаецца праз інтэрнэт, прыйдзецца дадаткова аплачваць за атрыманую інфармацыю. Таму трэба, каб прыстасаванне мела доступ да інтэрнэту.

Самы моцны канкурэнт «Аўтаспадарожніка» — «Навітэл Навігатар». Падрабязнасць карты мае тую самую іерархію — Мінск з дваравымі праездамі, абласныя цэнтры і яшчэ каля 20 гарадоў з інфармацыяй «да дома» і, нарэшце, схематычныя выявы астатніх населеных пунктаў з назвамі вуліц. Беларуская версія карты таннейшая за канкурэнта — ліцэнзія каштуе 69—84 тысячы рублёў. У дадатак, з сайта кампаніі можна спампаваць беларускамоўную агучку! Гэта значыцца, што навігатар будзе казаць, што «да наступнага паварота засталося» па-беларуску. Даступныя галасы «Алеся» і «Кастусь». Працуе і сэрвіс «Заторы». Праўда, інфармацыя ў Мінску неактуальная, бо датчыкаў у горадзе мала.

Еўрапейскія карты, як, напрыклад, IGQ, перадусім маюць дэталізаваную выяву ў суседніх заходніх краінах. У Беларусі іх можна выкарыстоўваць толькі пры транзітным руху праз краіну. Колькасць памылак у гарадах проста агромністая. Дастаткова сказаць, што ў IGQ у Мінску частка галоўнага праспекта названая вуліцай Дарашэвіча, а некаторыя вуліцы ў цэнтры горада маюць дарэвалюцыйныя назвы.

### Грашовае пытанне

Самыя недарагія навігатары, з маленькім экранам дыяганаллю ў 3,5 цаляў, каштуюць ад $90. Сярэдняя цана складае $120–140. Кожную з мапаў, названых вышэй, можна спампаваць у інтэрнэце бясплатна. Як вынік, піратцкія версіі выкарыстоўвае абсалютная большасць.

**Яўген Васількоў**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Дасканалы спосаб салення грыбоў

Маладыя баравікі адразу пасля таго, як іх прынеслі з лесу, ачысціць, укінуць у кіпень і трымаць на агні, пакуль не з'явіцца белая пена; тады выняць з рондаля, пакласці на сухі абрус і так трымаць, пакуль цалкам не астынуць. Тады класці баравікі ў слоік слаямі, перасыпаючы добра соллю. Поўны слоік прыціснуць дошчачкай, на дошчачку пакласці камень. Неабавязкова цалкам запоўніць слоік за адзін раз, можна дакладаць па некалькі грыбоў. Галоўнае, каб грыбы былі добра прыціснутыя і плавалі ў расоле.

### Рыжыкі марынаваныя на закуску да гарэлкі

Маладыя свежыя рыжыкі выцерці палатном да сухасці. На вышыню пальца наліць у слоік алею, змяшаць чатыры часткі солі і адну частку перцу, пакласці ў алей слой грыбоў, добра пасыпаць соллю і перцам, зноў палажыць рыжыкі і пасыпаць, і так рабіць, пакуль слоік не запоўніцца, прыціскаючы грыбы, каб ляжалі шчыльна. Наверх пакласці гнёт (каменьчык), а як грыбы зляжацца, то дапоўніць зноў даверху, пасля чаго накрыць слоік кавалкам паперы, абвязаць і захоўваць у халодным месцы.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1854.**
**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ВЫШЫЎКА**

**Запрашаем на курсы** беларускай народнай вышыўкі, заняткі з 1-га кастрычніка (Мінск). Т.: (029) 171-13-90.

**СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА**

**Запрашаем** у сяброўскае падарожжа «Будслаў і ваколіцы» 3 кастрычніка па маршруце: Даўгінава—Будслаў—Параф'янава—Сітцы—Кіякова—Ваўкалата—Старыя Габы—Гулі. Т.: 262-73-43, (029) 111-73-32.

**ПАКОЙ**

**Здаецца** пакой у прыватным доме. Недалёка ад ст.м. «Маскоўская»; без гаспадароў. Т.: (029) 818-49-06 (Кастусь).

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ВОСЬ У НАШ ЧАС...

# Каханне ў імперыі: вершы, грошы і раялі

У 1900-я на прасторах Расійскай Імперыі квітнелі газеты, праз якія адзінокія людзі шукалі сабе пару. І ў рэальнасці пошукі выглядалі зусім не так, як у рафінаванай тагачаснай літаратуры. Асноўнай з такіх газет была «Брачная газета», якая распаўсюджвалася нават у Еўропе і ЗША. З яе можна даведацца, што сучасныя аб'явы такога кшталту — гэта кветачкі. Чыталі яе і ў Беларусі.

### Шукаю раяль. Мэта — шлюб

Амаль ніхто не хаваў сваіх сапраўдных мэтаў: шукаючы шлюбу дзеля грошай, так і пісалі. Каб вылучыцца з агульнай масы, аўтары аб'яваў прыдумлялі арыгінальныя фармулёўкі. Галоўным было першае слова (ці словы), якое вылучалася тлустым шрыфтам. Напрыклад: «Аддаю перавагу хворым на сухоты». Далей у аб'яве тлумачыцца, што маладая ўдава шукае спадара сталага веку з капіталам, мэта — шлюб. Ну і адрас.

Увогуле фразай «мэта — шлюб» заканчваюцца амаль усе аб'явы, нават тыя, у якіх гэтая фраза выглядае эклектычна. «Малады музыка шукае музычную паненку (раяль, пажадана салонны). Мэта — шлюб». Гэта цяпер маладыя музыкі не ведаюць, як шукаць сабе якасныя інструменты, не тое што тады.

Асобная катэгорыя — дактары, якім трэба адкрыць клініку ці распачаць практыку, а для гэтага патрэбны першапачатковы капітал (мэта, зразумела, шлюб). Выгляд, узрост, маральныя якасці будучай жонкі большасці дактароў не цікавыя. А вось «капітал у тысяч пяць-шэсць» — без гэтага нікуды.




Проста здзіўляе колькасць паненак, сталых жанчын і паннячак, якія знаходзяцца ў пошуку мільянераў, прычым любога ўзросту і любой прапіскі. Ад мільянераў прапановаў мала — часцей з'яўляецца шляхта, згодная абмяняць тытул на ўзнагароду ў форме пасагу. Сума пасагу падаецца. Але што мы ўсё пра грошы ды пра грошы...

### Паэты-містыкі і «п'ю, куру, гуляю ў карты»

Палова тых, хто шукаў праз газету каханне, — паэты. У лепшым выпадку яны проста ўказвалі гэта як свой асноўны плюс. У найгоршым — афармлялі аб'яву ў вершах. Пра сябе звычайна пісалі, што «пакутуюць у жыццёвай імгле».

Шчырыя людзі загадзя папярэджвалі пра свае звычкі. Напрыклад: «П'ю, куру, гуляю ў карты — навошта гэта хаваць?». Іншым жа патрэбная жонка, якая б «малявала партрэты алеем, грала на гітары, была разумнай, адукаванай і прыгожай, любіла спорт — каталася на роварах і пажадана любіла літаратуру і пісала вершы». Пасля гэтага звычайна даюцца дакладныя параметры: рост-вага-бюст.

Асобна трэба ўзгадаць людзей, што ў пошуках кахання эканомілі грошы. Напрыклад, гэтую аб'яву не тое што перакласці — яе прачытаць і зразумець немагчыма: «Докторъ. прав., мол., нес. съ хор. хар., инт., своб., имеющий пока 3 т.р., г.д., желаетъ вступить въ зак. бракъ съ бар. или вдовой, симп., сост». Адзінае, што тут можна зразумець, — наяўнасць 3000 рублёў у скнары-кавалера.

Асобнае месца займаюць аб'явы, у якіх маладая паненка, што церпіць фінансавыя праблемы, пагаджаецца сустрэцца з маладым чалавекам, каб пазычыць 15 рублёў. Згадзіцеся, мілая і цалкам прыстойная рэклама.

Шмат знойдзецца тэкстаў і на польскай, і на ўкраінскай мове. Нават самадзейныя вершы з пазнакай: «Це не шутійно» («Гэта не жартам») і зваротным адрасам — горад Баку. Беларускамоўных аб'яваў няма. Напрыклад, брэсцкія дапісчыкі ўсе як адзін лічылі сябе палякамі. Чаму так? Гісторык Алесь Пашкевіч лічыць, што гэта абумоўлена мацнейшым развіццём нацыянальнага руху ва ўкраінцаў: «На пачатку XX стагоддзя не было яшчэ ўнармаванай пісьмовай беларускай мовы: асобныя брашуры калі і выходзілі пабеларуску, дык лацінкай. Мова была хутчэй размоўнай — узораў пісьмовай не было, тая ж «Наша Ніва» з'явілася ў 1906 годзе. З іншага боку — недахоп свядомасці ў той час, беларусы народам афіцыйна не лічыліся, вось і запісваліся хто ў палякі, хто ў расейцы».

**Юрась Ускоў**

## Кемікі



1) Для салаты зварылі 5 чырвоных буракоў. Варыліся яны 30 хвілін. Колькі хвілін спатрэбілася, каб зварыць 1 бурак?

2) Для салаты зварылі 6 яек за 7 хвілін. Колькі хвілін спатрэбіцца, каб зварыць 12 яек?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**
**Адказы глядзі на старонцы 16.**

# Беларускія кандытары вырабілі шакаладную Хатынь


АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

**Яе можна было бачыць на выставе «Хлебная і кандытарская справа — 2010» у Мінску.**

У межах выставы прайшоў адкрыты чэмпіянат кандытарскага мастацтва — «Шакаладная Беларусь». Лепшыя кандытары краіны проста на адкрыцці выставы стварылі кампазіцыі з шакаладу. Умовай конкурсу было стварыць выяву цікавай і відовішчнай мясціны Беларусі. Гродзенцы стварылі вялікі касцёл з белага шакаладу.

А вось берасцейцам адмовіў густ — яны вырабілі... шакаладную Хатынь, не забыўшыся пры гэтым выставіць вялізную шакаладную плітку з выказваннем Лукашэнкі.

Пасля публікацыі фота шакаладнай Хатыні на сайце «Нашай Нівы» арганізатары ўсвядомілі абсурд і прынялі яе.

Усе салодкія шэдэўры на выставе можна было не толькі пабачыць, але і пакаштаваць.


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Праз Беларусь праехалі ўдзельнікі коннага паходу «2000 кіламетраў гісторыі». Яны выправіліся да Чорнага мора па мясцінах, звязаных з гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага — магутнай дзяржавы беларусаў і літоўцаў.**




**Такія магніты на лядоўню вырабіла гродзенская майстрыха Яня Марчук.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Жаночая зборная па баскетболе прэзентавала сваю новую форму. Беларускі першыя ў свеце выйдуць на пляцоўку ў суkenках. Хай дзяўчатам шанцуе на чэмпіянаце свету, які неўзабаве пройдзе ў Чэхіі.**



**У ЗША прайшоў чэмпіянат свету сярод кастамаў — так называюць адмыслова, адзінкава выробленыя матацыклы. Беларуская каманда заняла на ім першае месца ў намінацыі Metric World Championship. Майстэрня Юрыя Шыфа прадставіла свой матацыкл The Machine, выгляд якога ствараўся ў духу нямецкага дызайну 30-х гадоў XX стагоддзя. На фота: Юрый Шыф на матацыкле The Machine.**

## Шаноўныя чытачы!

Наступны нумар «НН» выйдзе **6 кастрычніка**. Ураджайных Вам дакопак і грыбных паходаў, багатых на ўражанні вандровак у апошнія сонечныя дні восені!

## Анекдоты

***

МЗС Расіі выказала заклапочанасць у сувязі з выступам А.Лукашэнкі ў Пекіне, у якім кіраўнік Беларусі заявіў аб намеры ўсталяваць добрасуседскія адносіны з Кітаем.

***

Вернікі вынайшлі рэінкарнацыю, атэісты — клянаванне.

***

Пра тое, што ўсіх грыбоў не збярэш, адразу забываешся, трапляючы ў лес.

***

— Ну вось, жонка, хутка мы будзем жыць у дарогай кватэры, як ты хацела!
— Ура! Мы пераязджаем у элітны дом!
— Ды не, нам падвысілі кватрплату...

## «НН» сто гадоў з вамі

Гэтымі днямі быў у рэдакцыі «НН» цікавы вандроўнік, каторы выехаў на мотацыклетцы (машыне-самакатцы) з Адэсы і маніцца аб'ехаць кругом усю Расею. Дагэтуль пабываў ён у 40 вялікіх гарадах. Гэта малады хлопец, гадоў 19, украінец, родам з Херсонскай губерні.

**«НН». № 37. 1910.**

**Восеньскія графіці**

У Менску ля бібліятэкі імя Пушкіна назіраю такую карціну. На сценах бібліятэкі шмат дзе напісана: «БЕЛАРУСЬ – ГЭТА СВЯТОЕ» і «СВАБОДА або СМЕРЦЬ». Дама адміністрацыйнага выгляду ў прычосцы (мо дырэктарка бібліятэкі?) кантралюе мужыка ў марынарачцы, які спрытна водзіць пэндзлем па літарах (замалёўвае іх, але так, каб фарбы разыходзілася мінімум, ад чаго літары павялічваюцца ў памерах, але, у прынцыпе, не прападаюць) і дае свой каментар пасля кожнай рэплікі начальніцы. Выглядае прыкладна так:

Начальніца: Сколько можно писать! Пишут и пишут!

Мужык (водзячы пэндзлем, задаволена): Стена очень пористая.

Начальніца: Идиоты!

Мужык (абмакваючы пэндзаль у шэрую фарбу): Краски много уходит, очень много!

Начальніца: Скоты!

Мужык (зусім радасна): Пористая стена, большой расход краски, впитывает!

І ў ранішніх вадзіцеляў, і ў пралетараў, і ў чыноўнікаў рознага рангу, і нават у першакласнікаў пры другім поглядзе на метровыя літары аднолькавая думка: «Ці ж хацяб не злавілі іх!»

Восеньскія графіці, пароль і знак таго, што свае побач.

Знак таго, што маладыя застаюцца маладымі.

**«НН». № 38. 2000.**

**Адказы да старонкі 15:**
1) 7 хвілін; 2) 30 хвілін.

Наша Ніва
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6400.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 21.09.2010.
Замова № 4607.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614